ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 137 (3245) Серада, 19-га чэрвеня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

РАДЫЁ Ў ГАДЗ. НОЧЫ:

ВАРШАВА, 18. На каменнавугальных Капальнях Сасновіцкага вобчества забаставала 5.000 гарнякоў. Забастоўка ўзьнікла з прычыны таго, што рабочым выплачана ўсяго 70 проц. заработнае платы

АПОШНІЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). У акруговым судзе пачаўся разгляд справы аб абвале рыштаваньняў на пабудове гарбарні ў сакавіку г. г. У выніку абвалу 1 рабочы быў забіты і 13 паранена. Прычына катастрофы—нядбайныя адносіны інжынэра-тэхнічнага персаналу да тэхнікі бясьпечнасьці. На лаўцы падсудных 3 чал.

Асноўныя вынікі весняной пасеўнай кампаніі па СССР

Пляны машыназабесьпячэньня і трактаразабесьпячэньня значна павялічаныя ў параўнаньні з мінулым годам ня гледзячы на рад труднасьцяй, што стаялі на шляху, былі ў асноўным выкананы. Кантрактацыя ўпяршыню разгарнулася на практыцы досыць шырока і ахапіла амаль усе культуры. Упяршыню на практыцы разгарнулася доўгатэрміновая кантрактацыя. З посьпехам былі праведзены сартыроўка насеньня і рад іншых агранамічных і агра-тэхнічных мерапрыемстваў. У выніку ўсяго мы маем **бясспрэчны рост пасеўных плошчаў і павышэньне ўраджайнасьці.** Сацыялістычныя формы ў вёсцы разгортваюцца добра, прычым, у бягучым годзе, як і летась, памечаныя пляны застаюцца далёка ззаду. Як грыбы, растуць калгасы. Прадметам нашага гонару могуць быць вынікі разгортваньня вытворчасьці ў новых саўгасах. **Заданьні Зернатрэсту выкананы ў весняную пасеўную кампанію на 100 проц. і больш.**

Папярэднія матар'ялы паказваюць і рад слабых месц у правядзэнай кампаніі. У прыватнасьці, у радзе гарадоў, такая важная ў сучасны момант справа як арганізацыя рабочых агародаў не атрымала пэўнага разьвіцьця. Весняная пасеўная кампанія сьведчыць аб вялізных стымулах у асноўнай бядняцка-серадняцкай сялянскай масы. Пасеўная кампанія ўскалыхнула шырокія масы сялянства. У ходзе кампаніі ўзьніклі і разьвіліся новыя формы работы (аграмінімум) і новыя інстытуты (аграўпаўнаважаныя і вытворчыя нарады).

Лік агра-ўпаўнаважаных перавышае 100.000 чалавек. Што-ж датычыць аграмінімуму, дык па аднэй РСФСР лік прыгавараў аб правядзеньні аграмінімуму перавышае 200.000.

Усё гэта гаворыць аб поўным правале пляцформы правае апазыцыі. Гэта-ж правыя апазыцыянэры гаварылі пра адсутнасьць вытворчых стымулаў у асноўнай масы сялянства, у выніку быццам-бы няправільнай палітыкі партыі. Зараз, пасьля жыцьцёвае праверкі на важнейшай для вёскі кампаніі—пасеўная кампанія—сьмежнымі і мізэрнымі здаюцца гутаркі аб разрыве паміж рабочай клясай і сялянствам і аб дэградацыі сельскае гаспадаркі. На практыцы ўзмацняюцца новыя формы вытворчае сувязі, у ходзе і выніку паглыбленьня якіх дробная сялянская гаспадарка пераводзіцца на рэйкі буйное аграмаджанае гаспадаркі. Але мы не павінны захапляцца. Мы павінны памятаць, што гэта толькі першыя вынікі, што гэта толькі самы першы падыход да задачы паскарэньня ўздыму сельскае гаспадаркі, ліквідацыі яго празьмернай адсталасьці.

Кулак скрозь выступаў супроць правядзеньня аграмінімуму. Мы маем шматлікія выпадкі кулацкае агітацыі супроць ачысткі насеньня, супроць трактараў і г. д. Такім чынам, ва ўмовах сацыялістычнага наступленьня правядзеньне аграмінімуму сераднякамі і беднякамі супроць волі кулакоў зьявілася адназ з форм клясавае барацьбы ў вёсцы, і ў гэтай барацьбе перамагае ня кулак, а бядняцка-серадняцкія масы. Увесь інтарэс бягучага становішча заключаецца ў тым, **што на чале тэхнічнага прагрэсу на сяле становіцца рабочая кляса, што сьцяг тэхнічнага прагрэсу ў вёсцы нясе ня кулак, а рабочая кляса, якая трымае дзяржаўную ўладу ў сваіх руках.** Маса індывідуальных сялянскіх гаспадарак праз машынна-трактарныя станцыі пачынае абслугоўвацца перадавою тэхнікаю, пры дапамозе якой гэта дробная індывідуальная гаспадарка можа перайсьці на рэйкі перадавой буйнай аграмаджанай гаспадаркі. («Правда»).

АНГЛІЯ і СССР

ЗНАЧЭНЬНЕ САВЕЦКАГА РЫНКУ ДЛЯ АНГЕЛЬСКАГА ГАНДЛЮ

ЛЁНДАН, 17. Ініцыятар падарожжа ангельскае прамысловае дэлегацыі ў СССР Эрнэст Рэмнант, выступаючы на зьезьдзе анонсадаўцаў у Ньюкэстлі, падкрэсьліваў значэньне савецкага рынку для ангельскага гандлю.

«Пры нашых пошуках рынкаў,—сказаў Рэмнант,—СССР ня толькі павінен прымацца пад увагу, але яму, як відаць, прыдзецца заняць першае месца. Прапанова аб тым, каб СССР былі прадастаўлены адпаведныя крэдыты, заслугоўвае сурьёзнага абгаварэньня».

У сваёй прамове Рэмнант, між іншым, паведаміў, што створаны ангельскімі гаспадарчымі коламі «англа-расійскі камітэт» будзе пашыран для таго, каб у ім сапраўды былі прадстаўлены ўсе галіны ангельскае прамысловасьці. Нова-ўтвораны камітэт будзе называцца «Англа-расійская

ВА ЎСЕСАЮЗНЫМ КАМІТЭЦЕ ПА ХЭМІЗАЦЫІ СССР

Рад спрыяючых вынікаў, атрыманых пры так званым вапнаваньні глебы (г. зн. ужываньні вапны для ўгнаеньня глебы) прымусіў камітэт заняцца гэтым пытаньнем. Асобная, спэцыяльна скліканая камісія з спэцыялістых па даным пытаньні апошняе ўсебакова прапрацавала, прычым ідэя вапнаваньня была прызнана заслугоўваючай поўнага ўхваленьня. Вынікі работ камісіі будуць апублікованы.

У выніку работы камітэту ўрад прызнаў патрэбнасьць узмацненьня вырабу фасфарытнае мукі і павялічэньня фінансаваньня ўсіх работ, зьвязаных з фасфарытаваньнем.

Па даручэньні прэзыдыуму камітэту распрацавана пытаньне аб прасьцейшых сродках пратручваньня насеньня, якое можна было-б ужываць замест прывазнога з заграніцы. На падставе лябараторных даных, прапанавана ўзмацніць ужываньне попелу і вапнавага малака ў якасьці прадукту пратручваньня проса, аўсу і шпаніцы.

ПЫТАНЬНІ СЫРЦУ

Камітэт па хэмізацыі вывучыў рад пытаньняў, зьвязаных з сырцовай праблемай (вывучэньне розных, яшчэ мала дасьледваных, але вялікага значэньня відаў сырцу, вывучэньне адкідаў і інш.) і прапрацаваны рад пытаньняў па асобных відах сырцу.

Па серкава-кіслотнай прамысловасьці—прапанован рад мерапрыемстваў для забесьпячэньня гэтага віду прамысловасьці сырцом у разьмерах, адпавядаючых пяцігадоваму пляну: павялічэньне распрацовак старых і новых месцанараджэньняў, максымальнае скарыстаньне флётацыйнага пірыту на фабрыках Уралу, Каўказу і Алтаю, утылізацыя сярчанага газу, які адыходзіць у паветра на медзяплавільных і цынкавых

У сувязі са зьездам палякаў, якія заводах, частковая выпрацоўка серкавае кіслаты і серкі з медзістых пірытаў, якія маюць серку ў колькасьці 1,2-15 проц і, нарэшце,—скарыстаньні з гэтай мэтай розных адкідаў хэмічных вытворчасьцяй, якія маюць у сабе серку.

Па серкавай прамысловасьці — скарыстаньне яе натуральных рэсурсаў, а таксама — адкідаў (серка з адыходзячых газаў і флётацыйных калчаданаў).

Па содавай прамысловасьці—ужыты меры да забесьпячэньня патрэбнымі сродкамі раду навуковых работ, якія вядуцца па гэтым пытаньні; зьвернута ўвага Галоўхэму на необходнасьць перагляду плянаў навуковых работ па содзе і сульфаце і неабходнасьць узмацненьня падрыхтоўкі кадраў маладых спэцыялістых. Прапанован рад мерапрыемстваў для ўзмацненьня работ па утылізацыі прамысловых вод і вадарасьляй з мэтаю атрыманьня ёду.

Па графітнай прамысловасьці знойдзена патрэбным у самы кароткі тэрмін упарадкаваць яе і разьвіць па магчымасьці.

Намечан рад мерапрыемстваў па замене серка - кіслотнага спосабу ачысткі нафтапрадуктаў і расьлінных алеяў флёрыдынавымі і бэнтанітавымі глінамі *) з грузінскіх месцанараджэньняў, што дасьць магчымасьць ня толькі адмовіцца ад імпарту амэрыканскіх глін, але нават разгарнуць экспарт нашых.

*) Гэтыя гліны маюць вельмі каштоўную ўласьцівасьць затрымліваць пры фільтраванні праз іх нафтапрадуктаў і расьлінных алеяў смалу апошніх.

Да зьезду палякаў, што жывуць за межамі Польшчы

У сувязі са зьездам палякаў, якія жывуць па-за межамі Польшчы, што мае адбыцца ў Варшаве, у Віцебску адбыўся сход рабочых-палякаў фабрыкі «Дзьвіна», заводу «Мэтпром» і чыгуначнікаў. Сход, у прынятай рэзалюцыі выказаўся за ўдзел у зьезьдзе для таго, каб выкрыць пляны польскага фашызму і расказаць праўду аб дасягненьнях польскага працоўнага насельніцтва Беларусі.

Працоўныя палякі — зазначаецца ў рэзалюцыі, — зробяць усё, каб абараніць адзіную бацькаўшчыну міжнароднага пралетарыяту—СССР.

Сход абраў акруговы грамадзкі камітэт па правядзеньні выбараў. У склад камітэту абраны 5 чалавек, сярод іх адзін настаўнік, двое рабочых, адна работніца з фабрыкі «Дзьвіна» і адзін рабочы чыгуначнік. Акруговая канфэрэнцыя Віцебскае акругі назначана на 30 чэрвеня. Для выбару дэлегатаў на акруговую канфэрэнцыю ва ўсіх гарадох і сёлах будуць праведзены сходы прапоўнага польскага насельніцтва.

***

Цэнтральны грамадзкі камітэт па правядзеньні выбараў атрымаў паведамленьні аб арганізацыі акруговых грамадзкіх камітэтаў у гарадох Мазыры і Ворпы. У камітэты абраны рабочыя і сяляне-палякі.

***

У цэнтральным камітэце па правядзеньні выбараў у Беларусі нашаму супрацоўніку паведамілі аб пачатку выбараў на акруговыя канфэрэнцыі амаль ва ўсіх акругах. Сярод польскага працоўнага насельніцтва пачаўся таксама збор сродкаў на паездку дэлегацыі ў Варшаву, якая раскажа праўду аб Савецкім Саюзе і выкрые пляны польскага фашызму.

ПАНЫ ЗАПАЛОХАЛІСЯ

БАРШАВА, 17. Зьезд зарубежных палякаў у Варшаве будзе адбывацца з 14 да 18 ліпеня. Пасьля зьезду дэлегаты паедуць на выстаўку ў Познань і ў Кракаў. Зьезд будзе адбывацца пад апякунствам прэзыдэнта Масьніцкага і Пілсудзкага.

Арганізатары зьезду акрэсьліваюць лік зарубежных палякаў у 7 мільёнаў чалавек. Адначасова з больш падрабязнымі весткамі аб зьезьдзе праз блізкае да міністэрства замежных спраў агэнцтва «Прэс» газэтам разаслана паведамленьне, пад загалоўкам «Камуністычны замах на зьезд зарубежных палякаў. У паведамленьні бачан страх за дэлегацыю ў 14 чалавек, якая на чале з Домбалем зьбіраецца прыехаць на зьезд.

Шматтысячныя дэманстрацыі пратэсту па ўсёй Грузіі

Ядказ працоўных Грузіі на авантуры пілсудчыкаў і белаэмігрантаў

ПАН ПАТЭК НАВЕДАЎ т. КАРАХАНА

МАСКВА, 18. У сувязі з маніфэстацыямі грузінскай белай эміграцыі, што адбыліся ў Польшчы пры ўдзеле прадстаўнікоў польскіх улад, па ўсёй Грузіі адбыліся стыхійныя мітынгі і дэманстрацыі пратэсту супроць паводзін польскае ўлады, якія зьяўляюцца парушэньнем дагаворных абавязацельстваў Польшчы ў адносінах да СССР.

8-га чэрвеня ў Тыфлісе адбыліся шматтысячныя стыхійныя маніфэстацыі. Калёны дэманстрантаў праходзілі на працягу трох гадзін перад будынкам польскага консульства. 12-га чэрвеня гэтыя маніфэстацыі паўтарыліся ў значна большых разьмерах, прычым, на гэты раз з боку некаторых груп маніфэстантаў мелі месца эксцэсы ў выглядзе кіданьня ў будынак консульства гнілых яек.

Ня гледзячы на тое, што, паводле вестак з Тыфлісу, інцыдэнты былі выкліканы паводзінамі наасобных супрацоўнікаў польскага консульства, якія не праявілі адпаведнага спакою і такту ў час прахаджэньня маніфэстацыі,—13-га чэрвеня пры наведаньні польскім пасланьнікам у Маскве п. Патэкам наркамату замежных спраў, намесьнік народнага камісара па замежных справах т. Карахан выказаў п. Патэку спачуваньне з повану недапушчальных эксцэсаў, што мелі месца ў Тыфлісе.

Пан Патэк заявіў, што ён ня мае яшчэ інструкцый з Варшавы па гэтым пытаньні і таму пакуль што абмяжоўваецца просьбаю аб прыняцьці мер па бязапаснасьці консульства ў Тыфлісе. Тав. Карахан абяцаў п. Патэку прыняць належныя меры для папярэджаньня падобных інцыдэнтаў у далейшым.

У працэсе гутаркі, п. Патэк зьвярнуў увагу на тое, што, згодна атрыманых ім вестак, рух пратэсту ў Грузіі прыняў шырокі разьмер з вынясеньнем мноства рэзалюцый антыпольскага характару і што падобныя падзеі зьяўляюцца шкоднымі для савецка-польскіх адносін.

Тав. Карахан зазначыў п. Патэку на тое, што прычыну гэтых падзей трэба шукаць у тым абурэньні, якім ахоплен Савецкі Саюз і асабліва савецкая Грузія, у сувязі з маніфэстацыямі ў Польшчы супроць савецкай Грузіі з удзелам некаторых польскіх урадавых асоб.

***

МАСКВА. 14 чэрвеня п. Патэк наведаў т. Карахана з прычыны атрыманай ім інструкцыі польскага ўраду пратэставаць супроць інцыдэнту ў Тыфлісе.

Тав. Карахан прыняў гэта паведамленьне, і канстатаваў, што яшчэ да заявы польскага пратэсту, ён напярэдадні выказаў спачуваньне з повану інцыдэнту і што тым самым пытаньне можна лічыць вычэрпаным.

Стаўка на развал Антанты

Італьянскі друк пра новы ангельскі ўрад

РЫМ, 15. У Італьянскіх палітычных колах усё больш мацнее думка, што прыход да ўлады ўраду Макданальда, можа прынесьці Італіі яшчэ больш карысьці, чым ранейшыя італьянскія сымпатыі Чэмбэрлена. Першым спрыяючым вынікам перамены ўлады ў Англіі, у Італіі лічыцца няўхільнасьць некатораго паслабленьня англа-францускае Антанты.

У гэтых адносінах характэрным зьяўлуецца артыкул «Тэвэрэ», які, ўпыняючыся на маючых адбыцца перагаворах паміж Макданальдам і Гувэрам аб свабодзе мораў, піша: «Згода зьяўляецца вынікам роўнавагі сіл. Але паміж Англіяй і Амэрыкай такое роўнавагі ня існуе. Макданальд, зразумела, можа ўжыць і нацыфісцкі манэўр выходзячы з меркаваньняў ўнутраное палітыкі. Але ён ня знойдзе ніякае магчымасьці згаварыцца з усёразбуральным фінансавым імпэрыялізмам Амэрыкі. Мы глыбока пераконаны, што перагаворы з Амэрыкай выклічуць жорсткую рэакцыю ў рабочай партыі. Паглядзім тады у якім эўрапэйскім парту будзе шукаць Макданальд прыпынку, як будзе зварачацца з Амэрыкі. Нядаўна Макданальд прадказваў, што будзе праз дзесяць год. Але мы хацелі-б ад яго пачуць, што будзе праз дзесяць месяцаў, калі ўсе яго добрыя намеры будуць раздушаны як шкарлупа ад яек».

***

ЛЁНДАН, 17. Пасьля спатканьня з паслом ПАЗШ Даўэсам, Макданальд, са згоды амэрыканскага пасла апублікаваў заяву, у якой заазначаецца:

«Мы гаварылі пра сучасны стан пытаньня аб морскім разбраеньні, як ён складваецца паміж ПАЗШ і Вялікабрытаніяй. Гутарка была неафіцыйнай, мела агульны характар і зьяўляецца ў вышэйшай меры здавальняючай.

Спецыяльны карэспандэнт «Дэйлі-Гэральд» паведамляе, што Даўэс не перадаваў Макданальду запрашэньня наведаць ПАЗШ.

Да працэсу фабрыкатараў фальшывых чырвонцаў

НАФТАВЫЯ МАГНАТЫ—ГАЛОЎНЫЯ НАТХНІЦЕЛІ ЎСЯЕ СПРАВЫ

БЭРЛІН, 17. Бэрлінская пракуратура прадавіла абвінавачаньне да ўдзельнікаў справы па фабрыкаваньні фальшывых чырвонцаў. Грузіны Садацьерашвілі і Карундідзэ, а таксама ўласьнік друкарні ў Мюнхэне Шнайтар абвінавачваюцца ў выпуску і намеры выпушчаць фальшывыя грошы. Мэханік друкарні Шнайдара, Кіпіцр, Мюнхенскі інжынэр Вэбэр і ўласьнік кнігагандлю ва Франкфурце Бэлэ абвінавачваюцца ў дапамозе выпуску і намеры выпушчаць фальшывыя грошы. Доктар Бэкер абвінавачваецца ў распаўсюджаньні фальшывых грошай. Надыходзячы працэс павінен высьвятліць, у якой меры ажыцьцяўлялася супрацоўніцтва паміж грузінскімі палітычнымі дзеячамі і ангельскімі нафтавымі магнатамі, якім было абяцана права эксплёатацыі паўднёва-расійскіх нафтавых крыніц.

Галоўныя ўдзельнікі ўсяе справы, а іменна, нафтавыя магнаты з трэсту Дэтэрдынга «Раяль Дэйтч» аказаліся недасяжнымі для юстыцыі. Садацьерашвілі не адмаўляе факту вырабу фальшывых чырвонцаў. Ён заяўляе толькі, што пайшоў на гэтую справу, «каб вызваліць Грузію ад бальшавікоў». Карундідзэ, адказны кіраўнік грузінскага камітэту вызваленьня атрымаў з Англіі даручэньне падарваць каштоўнасьць савецкае валюты шляхам масавага вырабу фальшывых чырвонцаў. Карундідзэ даручыў выраб фальшывых чырвонцаў Садацьерашвілі, які меў моцных сувязі ў Баварскіх палітычных колах.

Абаронцы грузінскіх дзеячоў, на чале з бэрлінскім адвакатам Бэр хочуць давесьці, што справу па вырабу фальшывых чырвонцаў фінансаваў лідар баварскае фашысцкае арганізацыі Эрхардт і яго група. Пры гэтым абарона мае намер патрабаваць выклікі ў якасьці сьведак выдатных баварскіх палітычных дзеячоў.

Тав. Паўкер выпушчан з турмы

ВЕНА, 18. «Апарат Аруль Пралетарэ» паведамляе, што Марчэл Паўкер—былы член ЦК румынскае кампартыі пасьля 30-дзённае галадоўкі выпушчан з турмы.

Увага: Марчэл Паўкер — былы член ЦК румынскае кампартыі быў у 1926 г. завочна прыгаворан да 10 год турмы і 4 мая быў арыштаваны ў Бухарэсьце, дзе жыў нелегальна.

ПАРАЖЭНЬНЕ ПІЛСУДЧЫКАЎ НА МУНІЦЫПАЛЬНЫХ ВЫБАРАХ У ЛЮБЛІНЕ

ЯЎРЭЙСКІЯ ПАГРОМЫ У КРАКАВЕ

Масавыя арышты сярод рабочае моладзі.—Паліцыя разагнала рабочыя мітынгі ў Любліне

ЗЬБІЛІ КАМУНІСТЫЧНАГА ДЭПУТАТА

ВАРШАВА, 17. У нядзелю адбываліся муніцыпальныя выбары ў Любліне. **Урадавы сьпіс праваліўся, ня гледзячы на вялізны націск з боку ўлад. Анулявана сьпіс левага рабоча-сялянскага блёку заняў другое месца, сабраўшы 7.000 галасоў.** Пілсудчыкі страцілі свае галасы, галоўным чынам, у карысьць эндэкаў, а ППС на карысьць рабоча-сялянскага блёку.

За два дні да выбараў камуністычныя дэпутаты Керузальскі і Гаўрон арганізавалі ў Любліне мітынг каля аэрапляннага заводу. Сабралася звыш тысячы рабочых. Як толькі мітынг быў абвешчан адкрытым, паліцыя пачала разганяць прысутных. Паліцэйскія накінуліся на Керузальскага і адзін з іх ударыў Керузальскага кулаком па твару. Камісар паліцыі прабаваў адабраць у Керузальскага дэпутацкі білет. Рабочыя хацелі дапамагчы Керузальскаму, але паліцыя іх разагнала. Потым Керузальскі і некалькі рабочых былі арыштаваны. Па дарозе ў паліцыю камісар зноў ударыў Керузальскага па твары, заявіўшы пры гэтым: «Я пэпэсавец і ведаю, як з вамі абыходзіцца».

Дэпутат Гаўрон пашоў да старосты і заявіў, што калі Керузальскі ня будзе вызвален, ён прывядзе да турмы ўсіх люблінскіх рабочых. Староста даў загад вызваліць Керузальскага.

Увечары дэпутаты зьявіліся на мітынг ляўіцы ППС. Паліцыя зноў умяшалася і разагнала мітынг, зьбіваюць нават жанчын і дзяцей. Дэпутата Керузальскага так моцна ўдарылі кіем, што ён страціў прытомнасьць. Рабочыя аказалі рэзкае супраціўленьне і адбілі траіх арыштаваных. Каб абараніць дэпутатаў ад далейшага гвалту, рабочыя праводзілі іх да самага вакзалу. За апошнія дзе дні выбарчае кампаніі ў Любліне, паліцыя параніла звыш 20 удзельнікаў дэманстрацый левага рабоча-сялянскага блёку.

УКРАІНЦЫ БАЙКАТУЮЦЬ ПОЛЬСКАГА ПРЭЗЫДЭНТА

ВАРШАВА, 17. Падарожжу прэзыдэнта Масьціцкага на Вальнь надаецца асабліва ўрачыстасьці характар, але нават з паведамленьняў польскага агэнцтва відаць, што ніводная з прызнаных палітычных груповак ва ўрачыстасьцях ня ўдзельнічае. Другі дзень знаходжаньня прэзыдэнта ў Луцку быў запоўнен імшамі — у касьцеле, царкве і сынагозе.

АНТЫСЭМІЦКІЯ ВЫСТУПЛЕНЬНІ Ў КРАКАВЕ

ВАРШАВА, 17. Газэта «Момант» паведамляе, што, ідучы сьледам за іншымі польскімі гарадамі, у Кракаве арганізаваліся групы хуліганаў, якія зьбіваюць яўрэяў на вуліцах.

«ЧОРНЫ ГАБІНЭТ» У ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 17. У органе паштова-тэлеграфных служачых Швайцарыі было паведамленьне аб тым, што ў Польшчы ёсьць 2.160 пэнзараў, якія пераглядаюць усю прыватную карэспандэнцыю. Польскае тэлеграфнае агэнцтва абвяргае гэта паведамленьне.

ПІЛСУДЧЫКІ ДЗЕЙНІЧАЮЦЬ ПОДКУПАМ

ВАРШАВА, 13. Орган ППС «Роботнік» друкуе ліст пэпэсэўскага дэпутата Паёнка, у якім той заяўляе, што блёк беспартыйнага супрацоўніцтва» прабаваў падкупіць яго і прапанаваў яму, каб ён разам з усёю ППС-ацкай арганізацыяй Бельскага раёну перайшоў да групы Явароўскага.

КАТАРЖНЫЯ ПРЫСУДЫ

ВАРШАВА, 13. Акруговы суд у Лодзі прыгаварыў трох рабочых па абвінавачаньні ў камуністычнай дзейнасьці да 4-х год катаржнае турмы з пазбаўленьнем усіх правоў. Львоўскі акруговы суд прыгаварыў да трох год катаржнае турмы студэнта Сёмкіна, у якога была знойдзена камуністычная літаратура.

АРЫШТЫ СЯРОД МОЛАДЗІ

ВАРШАВА, 13. Толькі цяпер стала вядома, што ў канцы мая ў Варшаве зроблены шматлікія арышты сярод вучнёўскае моладзі і маладых рабочых. Па абвінавачаньні ў нелегальным распаўсюджаньні камуністычнае літаратуры арыштаваны вучаніцы 14 і 15 год.

ВЯЛІКАЯ ПЕРАМОГА БАТРАКОЎ

ВАРШАВА, 13. Орган аб'яднанага сельробу «Сельроб» паведамляе аб вялікай перамозе, атрыманай баставаўшымі сельска-гаспадарчымі рабочымі ў Раўскім павеце. Рабочыя дабіліся значнага палепшаньня свайго матар'яльнага становішча і прызнаньня прадстаўніцтва ад іх імя прафсэкцыянальнага саюзу працаўнікоў зямлі і лесу.

„Куцая" амністыя

АМНІСТЫЯ РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА АМАЛЬ ТОЛЬКІ НА КРЫМІНАЛЬНІКАЎ

ВЕНА, 17. Баўтарскі парлямант прыняў у першым зачытаньні ўрадавы законапраект аб амністыі. Як ужо паведамлялася, законапраект мае на мэце амаль выключна амністыю на крымінальных справах; што-ж датычыць асоб асуджаных па палітычных справах, дык амністыя распаўсюджваецца толькі на самыя нязначныя справы, што ўзьніклі да 1925 году.

Выступаўшыя ў спрэчках дэпутаты сацыялістычнай рабочай партыі падкрэсьлівалі, што законапраект зьяўляецца толькі манэўрам, мэта якога—ухіліцца ад правядзеньня сапраўднае амністыі па палітычных справах.

У процівагу законапраекту сацыялістычная рабочая партыя высунула патрабаваньне ўсеагульнай і поўнай амністыі па палітычных справах. Да гэтага патрабаваньня далучыўся прадстаўнік левага крыла сялянскага саюзу Драгнёў.

Прыезд у СССР францускай каапэрацыйнай дэлегацыі

НЕГАРЭЛАЕ, 18. (Па тэлефону ад наш. спэц. кар-та). А 8-ай гадзіне ўвечары з варшаўскім экспрэсам прыехала дэлегацыя францускай фэдэрацыі спажывецкай каапэрацыі ў складзе 17 чалавек. Дэлегацыя была спаткана старшынёй Белкаапсаюзу тав. **Хаскіным,** членам праўленьня Белкаапсаюзу тав. **Скокам,** старшынёй праўленьня Менцэрабкопу тав. **Кацам** і прадстаўніком Цэнтрасаюзу.

У дэлегацыю ўваходзяць вядомыя каапэрацыйныя працаўнікі Францыі, якія кіруюць каапэрацыйнымі аб'яднаньнямі ў рознастайных акругах. Сярод прыехаўшых усе рэфармістыя і беспартыйныя, за выключэньнем двух, якія зьяўляюцца членамі францускай кампартыі. **Старшыня дэлегацыі—Руасон**—генэральны сакратар фэдэрацыі францускай спажывецкай каапэрацыі, і нам. старшыні міжнароднага каапэрацыйнага альянса. Між іншым, сярод дэлегатаў: прадстаўнік аднаго з камуністычных каапэратываў Вотэро—у мінулым удзельнік паўстаньня францускіх маракоў на Чорным моры і загадчык каапэрацыйным аддзелам Бюро працы пры Лізе Нацый г. Фоке.

У часе вячэры ў буфэце ст. Негарэлае таварышы, якія сустракалі дэлегацыю і старшыня дэлегацыі абмяняліся прывітаньнямі.

Выступіўшы тав. **Хаскін,** між іншым, сказаў:

— Мы ўпэўнены, што вам удасца шырока азнаёміцца з вялізарнымі дасягненьнямі савецкай каапэрацыі, якія сталі магчымы ў краіне саветаў толькі дзякуючы дыктатуры пралетарыяту. Мы ўпэўнены, што вам удасца вывучыць шмат новых мэтадаў і форм будаўніцтва савецкай каапэрацыі. Мы верым, што пасьля ўсебаковага азнаёмленьня з сацыялістычным будаўніцтвам вы будзеце імкнуцца выкрыць усе паклёпы, якія распаўсюджваюцца пра СССР і пра савецкую каапэрацыю. Што датычыцца нашых дасягненьняў, дык іх яскрава характарызуюць наступныя некалькі лічбаў: звароты спажывецкай каапэрацыі дасягаюць 15 мільярдаў руб., яна яднае 23 мільёны пайшчыкаў. Няменшых вынікаў дасягнула спажывецкая каапэрацыя БССР, якая ахапіла больш 80 проц. членаў прафсаюзаў (200.000 чалавек) і 500.000 сялянскіх гаспадарак, яе звароты складаюць 300 мільёнаў руб.

— Савецкая каапэрацыя праводзіць таксама вялікую культурна-масавую працу.

— Запрашаем вас,—заканчвае сваё прывітаньне тав. Хаскін,—азнаёміцца з беларускай каапэрацыяй.

Старшыня дэлегацыі **Руасон,** які выступіў з адказам, перадаў ад імя дэлегацыі падзяку за сардэчнае спатканьне.

— Я ўжо другі раз у СССР,—сказаў Руасон. У першы раз, у 1922 г. я быў у СССР, калі ён перажываў цяжкія гадзіны. Па першых ураджаньнях сёньня і па вестках, якія я тут чуў, бачу, што вы сапраўды дабіліся вялізарных посьпехаў.

— Зусім зразумела, што каапэрацыя моцна разьвіваецца там ,дзе яна апіраецца на дзяржаўную ўладу. Ня дзіва, што ў вас ёсьць такія посьпехі.

— Запэўняю вас, што мы прыехалі без усякіх прадузятых думак і яскрава жадаем азнаёміцца з рознастайнымі дасягненьнямі савецкай каапэрацыі.

— Вельмі ўдзячны за запрашэньне наведаць Менск. На зваротным шляху, калі дазволіць час, наведаем вас.

Мэты нашай паездкі

(Гутарка з старшынёй дэлегацыі)

Гр-н Руасон у гутарцы з нашым спэцкорам сказаў наступнае аб мэтах дэлегацыі:

— Мы жадаем азнаёміцца ня толькі з Цэнтрасаюзам, але і з нацыянальнымі каапэрацыйнымі аб'яднаньнямі.

— Дэлегацыя хоча ўбачыць, чым француская каапэрацыя можа быць карыснай савецкай і наадварот.

— Француская дэлегацыя,—кажа ён,—прыехала ў СССР, як да сваіх прыяцеляў. Азнаёміўшыся з вашай працай, мы будзем выкрываць паклёпы, якія распаўсюджваюцца пра вас, што мы ўжо рабілі, працуючы ў міжнародным каапэрацыйным альянсе.

— У працягу двух тыдняў думаем пабываць у Маскве, Растове на Дану, Кіеве, Харкаве.

— Я лічу, што ўдасца ўстанавіць больш цесную гандлёвую сувязь паміж францускай і савецкай каапэрацыяй. Мы можам завозіць абутак, кансэрвы і атрымліваць ад вас мех, лес, лён.

— Практычныя вынікі нашай паездкі выявяцца пасьля перамоў з Цэнтрасаюзам.

Л.

Падрыхтоўка да міжнароднага антыімпэрыялістычнага дня

Француская кампартыя мабілізуе масы

ПАРЫЖ, 17. Француская кампартыя разгортвае кампанію па падрыхтоўцы міжнароднага антыімпэрыялістычнага дня 1-га жніўня, сканцэнтроўваючы пры гэтым асаблівую ўвагу на прадпрыемствах ваеннай прамысловасьці і на фабрыках і заводах, якія могуць быць скарыстаны ў час вайны для работы «на абарону».

Ячэйкі партыі на прадпрыемствах выкрываюць перад рабочымі зацікаўленасьць прадпрыемцаў у росьце ўзбраеньняў і паказваюць на ўзмоцненую падрыхтоўку да новай сусьветнай вайны, накіраванай супроць СССР. Кампартыя ў ходзе разьвіваемай ёю кампаніі выкрывае таксама здрадніцкую ролю сацыял-дэмакратыі і ўдзел яе ў падрыхтоўцы новай сусьветнай бойні, прычым, яскравай ілюстрацыяй служыць факт, што меў месца ў Тулузе, дзе муніцыпальны савет, на чале якога стаяць сацыялістыя, асыгнаваў 2 мільёны франкаў на фармаваньне новай авіяцыйнай эскадрыльлі.

Паветраныя катастрофы

БЭРЛІН, 16. У Заходняй Прусіі у час палёту зваліліся і разьбіліся на сьмерць сусьветны чэмпіён у галіне плянаваньня Шульц і планерысты Кайзэр.

ЛЁНДАН, 17. Самалёт «Горад Прэторыя», што рабіў пералёт праз Ла-Манш, зваліўся ў мора. Адна пасажырка забіта, чатыры пасажыры паранены і 7 пасажыраў загінулі нямаведама дзе, думаюць, што яны ўтапіліся.

ЛЁНДАН, 17. Пры аварыі ангельскага вайсковага самалёту забіты 2 лётнікі. Паводле слоў агэнцтва Рэйтэр, гэта 13-я аварыя за год.

Нямецкі імпэрыялізм патрабуе калёній

БЭРЛІН, 14. Нямецкая сэкцыя Лігі барацьбы супроць імпэрыялізму выпусьціла адозву, у якой заклікае да барацьбы з адноўленым нямецкім імпэрыялізмам, які патрабуе зноў калёній для Нямеччыны.

У адозьве канстатуецца нязвычайны размах калёніяльнае прапаганды і стварэньне на гэтай глебе адзінага фронту ад нацыяналістых да сацыял-дэмакратаў. Адозва падкрэсьлівае небясьпеку стварэньня на гэтай глебе адзінага імпэрыялістычнага фронту супроць СССР і ўсяго міжнароднага пралетарыяту.

9 гласных горада Кальмара выключаны з францускае кампартыі

ПАРЫЖ, 17. Палітбюро францускае кампартыі выключыла з партыі 9 камуністычных гласных горада Кальмара за тое, што яны заключылі ў другім туры выбараў згоду з членамі клерыкальнае партыі. Гэта згода пашкодзіла як агульнай барацьбе францускае кампартыі, так і яе анты-імпэрыялістычнай кампаніі ў Эльзасе. Перад прыняцьцем пастановы аб выключэньні 9 гласных палітбюро патрабавала ад іх, каб яны падалі ў адстаўку, аднак, яны адмовіліся гэта зрабіць.

◆◆◆◆ ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ ◆◆◆◆

НА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ БУДОЎЛІ

АДКРЫЦЬЦЕ ДВУХ НОВЫХ КАРПУСОЎ У ІВАНАВЕ-ВАЗЬНЯСЕНСКУ

ІВАНАВА-ВАЗЬНЯСЕНСК, 18. Адбылося ўрачыстае адкрыцьце двух новапабудаваных карпусоў Іванава-Вазьнясенскага мэталя-заводу, які выпушчае тэкстыльныя машыны. Новыя цэхі абсталяваны заграничнымі варштатамі самых новых канструкцый. Завод будзе выпушчаць штогод фарбавальна-агрэтурныя машыны на 8.000.000 рублёў. Пабудова і абсталяваньне новых карпусоў каштавалі 2 з пал. міл. руб.

СССР ЗОЙМЕ ПЕРШАЕ МЕСЦА ПА ЗДАБЫЧЫ ЗОЛАТА

ІРКУЦК, 18. Адбылася закладка першай у Сібіры сталеліцейнае печы на мэтзаводзе Саюззолата. Завод выпрацоўвае сьвідравальныя варштаты. Печ прыступіць да работы 1-га студзеня.

Старшыня Саюззолота

Работу прафсаюзаў па новаму

Для таго, каб сацыялістычнае спаборніцтва не абярнулася ў кампанію, для таго, каб яно ўвайшло ў штодзенны ўжытак работы прафсаюзаў, уся работа прафсаюзных арганізацый павінна быць прыстасавана да абслугоўвання спаборніцтва. Калі на першым этапе кіраўніцтва ім зьвязвалася з арганізацыяй асобных штабаў, дык з таго моманту, калі дагавор аб спаборніцтве ўжо заключаны кіраўніцтва спаборніцтвам пераходзіць непасрэдна да вытворчай камісіі.

Агляд вытворчых нарад, зроблены «Правдой», паказаў, аднак, што масавая эканамічная работа прафсаюзаў усё яшчэ пастаўлена далёка нездавальняюча. Пры гэтых умовах перадача кіраўніцтва спаборніцтвам вытворчай камісіі павінна ісьці побач з карэнным перагрупам саміх мэтадаў работы вытворчых камісій і вытворчых нарад.

Перш за ўсё трэба дабіцца лепшага выкананьня прапаноў, што прымаюцца на вытворчых нарадах. Усякі пад'ём ініцыятывы рабочай масы—а сацыялістычнае спаборніцтва немагчыма без такога пад'ёму—будзе выклікаць узмацненьне крыўдзкі прапаноў рабочых на вытворчых нарадах. Калі з гэтым прыцёкам прапаноў нарады ня будуць спраўляцца, дык гэта няўхільна будзе адбівацца і на самым ходзе спаборніцтва. Вось чаму работа часовых кантрольных камісій на прадпрыемствах павінна быць спэцыяльна згрупавана на праверцы выкананьня пастаноў вытворчых нарад.

Цяжка ўявіць сабе прадпрыемства, на якім у часе сацыялістычнага спаборніцтва не існавала-б часовай кантрольнай камісіі для праверкі вынікаў прапаноў, што прымаюцца на вытворчых нарадах. Сама работа часовых кантрольных камісій павінна быць пастаўлена так, каб яна магла справіцца з праверкай усіх тых прапаноў, якія прымаюцца на вытворчых нарадах. Зразумела, што без мабілізацыі ўсяго актыву прадпрыемства, без энэргічнай дапамогі з боку інжынэрна-тэхнічных сіл, часовая кантрольная камісія в такім пад'ёмам сваіх задач ня ў стане будзе справіцца.

Сацыялістычнае спаборніцтва няўхільна высоўвае, як чарговую задачу, арганізацыю пры трэстах часовых кантрольных камісій, абраных на рабочых сходах прадпрыемстваў, што ўваходзяць у трэсты. Цэлы рад пытаньняў, што ўзьнікаюць у зьвязку з спаборніцтвам на асобных прадпрыемствах, упіраецца і ў мэтады тэхнічнага кіраўніцтва з боку трэсту, і ў мэтады калькуляцыі і вылічэньня сабекошту. Без часовых кантрольных камісій пры трэстах такія пытаньні няўхільна будуць вісець у паветры, рабочыя ня будуць атрымліваць на іх здавальняючыя адказы і ў выніку будуць з меншаю зацікаўленасьцю адносіцца да самога ходу спаборніцтва.

Работа часовых кантрольных камісій на прадпрыемствах, дзе адбываецца спаборніцтва, арганізацыя такіх камісій пры трэстах можа быць пасьпяховай толькі пры ўмове, калі адначасова будуць палепшаны і мэтады кіраўніцтва масавай эканамічнай работы з боку прафсаюзных арганізацый. Да гэтага часу гэта кіраўніцтва мела ўсюды напаўрэвы цыркулярны характар. Трэба зараз, каб і абласныя, і губэрскія, і раённыя прафсаюзныя арганізацыі, як мага часьцей выбіралі працаўнікоў вытворчых камісій, каб яны маглі як мага часьцей абгаворваць тыя пытаньні, якія будуць узьнікаць у практыцы сацыялістычнага спаборніцтва. З асаблівай увагай павінны аднесьціся прафсаюзы да арганізацыі часовых кантрольных камісій пры трэстах, як да новай справы, якую трэба з самага пачатку паставіць так, каб праз часовыя кантрольныя камісіі пры трэстах найлепшым зьвязаць работу прадпрыемстваў з работай трэстаў, каб і самую работу трэстаў паставіць пад сапраўдны кантроль рабочых мас.

Сацыялістычнае спаборніцтва само па сабе азначае новую веху ў разьвіцьці прафсаюзнага руху. Прафсаюзы, як арганізатары працоўнага пад'ёму рабочых мас, прафсаюзы, якія выхоўваюць у масах правільнае разуменьне таго, што рабочая клясa зьяўляецца гаспадаром вытворчасьці і што кожны рабочы паасобку нясе адказнасьць за выкананьне задач, што стаяць перад усёй рабочай клясай у справе сацыялістычнай перабудовы народнае гаспадаркі,—павінны знайсьці і новыя мэтады работы. Да апошняга часу яшчэ многія прафсаюзныя арганізацыі не разумеюць тых новых задач, што стаяць перад намі ў зьвязку з пяцігадовым плянам сацыялістычнай перабудовы народнае гаспадаркі. Яшчэ цэлы рад прафсаюзных арганізацый не разумее, што без рашучай барацьбы з бюрократызмам унутры прафсаюзных арганізацый, без самага сьмелага і рашучага разгортваньня самакрытыкі немагчима ажыцьцяўленьне гэтых новых задач.

Вось чаму працаваць пановаму—гэта значыць у той-жа час самым рашучым чынам змагацца і з усімі тымі недахопамі ў рабоце прафсаюзаў, якія перашкаджаюць ім стаць сапраўднымі арганізатарамі працоўнага пад'ёму рабочых мас, стаць сапраўднымі кіраўнікамі сацыялістычнага спаборніцтва.

І. Н.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Генэральная праверка і чыстка партыйных радоў

У пэрыяд чысткі праверым клясавую баяздольнасьць і палітычную ўстойлівасьць кожнага камуністага

Па Менскай акрузе з 24-га чэрвеня пачынаецца чыстка вясковых парт'ячэек.—Зараз праходзяць праверку вайсковыя партарганізацыі

Пачалася праверка і чыстка ячэек

16-га чэрвеня ў лягерах Н-скай кавалерыйскай дывізіі адбыліся першыя сходы па праверцы і чыстцы дывізійнай партыйнай арганізацыі.

Сходы адбыліся па трох палкавых арганізацыях дывізіі.

Праверку праводзілі тры праверачныя тройкі пад старшынствам т. т. **Любамірскага, Раманчука і Левіна.** На сходах старшыні праверачных троек зрабілі даклады аб задачах і палітычным значэньні чысткі партыі.

Сакратары палкавых калектываў, дзе адбываліся сходы, выступілі з дакладамі аб становішчы калектываў і праробленай рабоце.

Аб актыўнасьці сходаў можна судзіць па такім факце.

Сходы пачаліся а 6-ай гадзіне і скончыліся позна ўначы. За гэты час праверачныя тройкі пасьпелі праверыць толькі па 3-4 таварышы.

Гэта тлумачыцца тым, што ў праверцы прынялі самы актыўны ўдзел радавыя партыйцы, беспартыйныя чырвонаармейцы і камандзіры.

Таварышом, што праходзілі праверку, задаваліся самыя рознастайныя пытаньні аб'ектыўнага характару.

Больш усяго было пытаньняў наконт сувязі з вёскай работы ў ячэйцы і дысцыпліны.

Праверка працягваецца. Учора адбыліся праверачныя сходы па іншых палкавых арганізацыях дывізіі.

Камісіі па чыстцы партарганізацыі дывізіі мяркуюць скончыць сваю работу праз 10 дзён.

Г. Т.

Выправіць недахопы ў падрыхтоўчай рабоце

Забясьпечыць стопроцантную яўку на праверачныя сходы

Што пастанавіла бюро Мен. АК КП(б)Б

Сходы па праверцы таварышоў, вылучаных у праверкомы, скончыліся.

Сходы паказалі, што ў праверкомы вылучаны лепшыя таварышы — сапраўдныя камуністы. Ніякіх адводаў супроць т. т., вылучаных у праверачныя камісіі, не паступіла. Ня было таксама выступленьняў, якія-б грунтаваліся на глебе асабістых разрахункаў. Сходы прайшлі пад знакам дзелавой самаправеркі і самакрытыкі, пад знакам актыўнасьці і поўнага разуменьня палітычных задач чысткі партыі.

Аднак, адзначаючы пэўныя посьпехі ў правядзеньні праверкі, мы ня можам прайсьці міма тых недахопаў, якія мелі месца ў працэсе работы праверачных сходаў.

На апошнім пасяджэньні бюро Менскага АК КП(б)Б намесьнік старшыні Мен. АКК тав. **Жуковіч** зрабіў інфармацыю аб ходзе праверкі складу праверачных камісій.

Тав. **Жуковіч** адзначыў, што асобныя парт'ячэйкі, члены і кандыдаты партыі і нават асобныя члены бюро і сакратары парт'ячэек зусім дрэнна наведваюць куставыя партсходы на праверцы таварышоў, вылучаных у праверкомы.

На гэтым трывожным факце мы павінны завастрыць усю нашу ўвагу.

Апошнія праверачныя сходы прайшлі пры далёка няпоўнай яўцы. Так, на куставым партсходзе ў клюбе друкароў прысутнічала менш паловы партыйцаў, якія павінны былі прыйсьці на сход у абавязковым парадку.

Праверачная камісія своячасова рэагавала на гэтае парушэньне партдысцыпліны. Усім бюро ячэек, якія павінны былі прысутнічаць на сходзе, камісія абвясьціла вымову.

Здаецца, што партыйныя ячэйкі павінны былі ўлічыць гэта і папярэдзіць паўтарэньне такіх выпадкаў.

Аднак, яўка на чарговы куставы партсход у клюбе імя Карла Маркса была яшчэ горшай. Асобныя ячэйкі на сход зусім не зьявіліся. Нават сакратары гэтых ячэек (парткалектыў камуністычнага унівэрсытэту і ячэйка КП(б)Б ВСНГВ) ня прышлі на сход. На сходзе ў клюбе імя Розы Люксэмбург вусім ня было камуністых **фабрыкі абутку і гуты «Пралетары».** А між іншым гэтыя ячэйкі павінны былі прысутнічаць на сходзе.

Бюро Мен. АК КП(б)Б заслухаўшы інфармацыю т. Жуковіча канстатавала, што:

— Асобныя члены і кандыдаты партыі і нават сакратары і члены бюро асобных ячэек зусім дрэнна наведваюць куставыя парсходы па праверцы складу праверачных камісій.

Таму Бюро АК абавязвала РК і ячэйкі зрабіць усе захады да зьнішчэньня гэтага зьявішча, дабіцца поўнай яўкі на праверачныя сходы і шырэйш прыцягнуць да удзелу у праверцы беспартыйных рабочых і работніц.

Праверкі кіруючых кадраў

У Гомель прыбывае камісія ЦКК УсеКП(б) па праверцы кіруючага складу КП(б)Б, для праверкі членаў і кандыдатаў ЦК, членаў ЦКК КП(б)Б, членаў і кандыдатаў бюро Акругкому, прэзыдыуму АКК і членаў вайсковых партканісій, якія падлягаюць праверцы камісіяй ЦКК УсеКП(б). Камісія будзе праводзіць праверку на адкрытых куставых сходах вытворчых ячэек КП(б)Б. Такіх сходаў будзе праведзена ў Гомелі сем. Першы сход мае адбыцца 21 чэрвеня.

У сувязі з пачаткам праверкі Бюро Гомельскага Акругкому і Прэзыдыум АКК, па даручэньні камісіі, зьвярнуліся з заклікам да ўсіх членаў партыі рабочых і чырвонаармейцаў прыняць актыўны ўдзел у праверцы.

Акруговая газэта «Полесская Правда» апублікавала сьпісы таварышоў, якія падлягаюць праверцы, час і месца праверкі.

Чыстка вясковых арганізацый КП(б)Б

24 ЧЭРВЕНЯ ПАЧЫНАЕЦЦА ЧЫСТКА ВЯСКОВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ КП(б)Б. ЧЫСТКА БУДЗЕ ПРАВОДЗІЦЦА АДНАЧАСОВА ПА ЎСІХ РАЁНАХ МЕНСКАЙ АКРУГІ.

ДЛЯ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ЧЫСТКІ ВЫЛУЧАНА 17 КАМІСІЙ. У БЛІЖЭЙШЫ ЧАС КАМІСІІ ВЫЯЖДЖАЮЦЬ НА РАЁНЫ. У КОЖНЫМ РАЁНЕ БУДЗЕ ПРАЦАВАЦЬ АДНА КАМІСІЯ.

КАМІСІІ ПРЫСТУПАЮЦЬ ДА РАБОТЫ 24 ЧЭРВЕНЯ.

СЁНЬНЯ Ў МЕН. АКК КП(б)Б АДБУДЗЕЦЦА ІНСТРУКЦЫЙНАЯ НАРАДА ТАВАРЫШОЎ, ВЫЛУЧАНЫХ У КАМІСІІ ПА ПРАВЕРЦЫ ВЯСКОВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ КП(б)Б.

Члены партарганізацыі АБВШ —праходзяць праверку

Пачалася праверка партыйнай арганізацыі АБВШ.

Першыя праверачныя сходы адбыліся 16-га чэрвеня. Сходы па чыстцы арганізацыі абарнуліся ў шырокую праверку работы партыйных ячэек АБВШ.

Учора ў лягерах працягваліся праверачныя сходы.

Узяліся за вывучэньне пастаноў XVI канфэрэнцыі

(Партарганізацыя №-скага артпалка)

Партыйная арганізацыя нашага палка ўзялася за прапрацоўку пастаноў XVI ўсесаюзнай партканфэрэнцыі. 13 чэрвеня пачаліся заняткі ў гурткох. З чырвонаармейцамі на палітзанятках прапрацоўвалася пытаньне аб выніках канфэрэнцыі. Пры распрацоўцы гэтага пытаньня з чырвонаармейцамі галоўным чынам завастрылася іх увага на практычных шляхах ажыцьцяўленьня пастаноў канфэрэнцыі ў галіне калектывізацыі сельскае гаспадаркі.

Зараз распачынаецца спаборніцтва на лепшае вывучэньне пастаноў канфэрэнцыі. Для дапамогі партыйным камсамольскім і чырвонаармейскім масам пры батарэях палка арганізаваны кансультацыйныя тройкі.

Газэты на сваіх старонках адводзяць шмат мейсца папулярызацыі пастаноў канфэрэнцыі, а бібліятэка набыла шмат літаратуры па пытаньнях канфэрэнцыі.

ШПІЛЕЎСКІ.

Некаторыя вынікі перавыбараў бюро

(ГОМЕЛЬСКАЯ ГАРПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ)

Перавыбары бюро парт'ячэек гарадзкога раёну выразна гавораць нам аб тым, што партарганізацыя ў асноўным ідэалёгічна моцная. Ячэйкамі быў даны рашучы адпор розным ухілам ад лініі партыі. Аднак, частка ячэек абмяжоўваецца разважаньнямі аб правай небясьпецы, не выкрываючы канкрэтных фактаў праяўленьня правага ўхілу і прымірэнцтва. Значная частка партыйцаў яшчэ ня зусім разумее небясьпеку гэтага ўхілу.

У значнай частцы ячэек пытаньні вытворчасьці займаюць цэнтральнае месца ў рабоце. Гэтым часткай і тлумачыцца некаторае паляпшэньне працоўнай дысцыпліны. Ячэйкі сталі больш патрабаваць (асабліва пасьля прапрацоўкі лісту ЦК УсеКП(б) аб працоўнай дысцыпліне) ад членаў партыі прыкладнасьці на вытворчасьці. Сацыялістычнае спаборніцтва яшчэ не захапіла ўсіх ячэек. У тых ячэйках, дзе больш увагі зьвернута на гаспадарчае кіраўніцтва, лепш ідзе спаборніцтва. На фабрыцы «Камінтэрн» і шчаўпінай, у Палесдруку і на гарбарні ўдалося дабіцца некаторых станоўчых вынікаў.

Асаблівы недахоп—слабая культмасавая работа. Галоўная бяда тут— няўвязка выхаваўчай работы з практычнай работай па гаспадарчым будаўніцтве (рацыяналізацыя, зьніжэньне сабекошту, узьняцьце прадукцыйнасьці працы і інш.).

У некаторых прадпрыемствах пасьля правядзеньня агляду вытворчых нарад паслабла работа апошніх. На радзе прадпрыемстваў па 4-5 месяцаў ня было ніводнае вытворчае нарады. (Часткай гэта тлумачыцца правядзеньнем розных кампаній). Гэта найбольш слабое месца ў рабоце нашых нізавых праф'ячэек трэба безадкладна ўмацаваць.

У справе беларусізацыі заўважваецца застой.

Некаторая частка членаў партыі яшчэ да гэтага часу ня ўцяліла значэньня беларусізацыі. Беларуская мова слаба вывучаецца ў ячэйках.

Частка савецкіх ячэек усё яшчэ не падыйшла ўсутыч да пытаньняў паляншэньня апарату; барацьба з бюракратызмам, рацыяналізацыя, спрашчэньне апарату, зьніжэньне кіраўнічых выдаткаў (ячэйкі ЦРК і Акрфінаддзелу).

Усе гэтыя недахопы і рад іншых адзначаліся на сходах. Самакрытыка за некаторым выключэньнем была дзелавой, з цікавым зьместам. Сярэдні процант выступаўшых складае 37. У некаторых-жа ячэйках гэта лічба даходзіла да 60 проц.

Па вытворчых ячэйках 91 проц. нанава абраных членаў бюро складаюць рабочыя, тыя, што непасрэдна працуюць ля варштату—67,5 проц., сакратары ячэек з рабочых—91,5 проц. Склад бюро абноўлены на 56 проц. (пры мінулых перавыбарах—на 54 проц.), склад сакратароў абноўлены па 34,5 проц. (пры мінулых перавыбарох—на 34 проц.).

Большасьць членаў бюро складаюць маладыя партыйцы (з 24-26 г. г.). Сакратароў членаў партыі з 24-26 г.—61 проц. Гэта становішча ставіць перад райкомам пытаньне аб сыстэматычнай рабоце па выхаваньні актыву і аб узмоцненым штодзённым кіраўніцтве дзейнасьцю ячэек.

У савецкіх ячэйках большасьць членаў бюро складаюць рабочыя (52 проц.), сакратароў ячэек з рабочых—65 проц. Членаў бюро партыйцаў са стажам да 17 г.—3 проц., 17-23 г.—52 проц. Сакратароў ячэек з партстажам да 17 г.—4½ проц., 17-23 г.—69,5 проц. Склад бюро ячэек абноўлены на 53 проц. Склад сакратароў—на 26 проц.

Падрыхтоўка да перавыбараў праведзена здавальняюча. У значнай частцы ячэек выпускаліся спэцыяльныя нумары насьценгазэт, праводзіліся гутаркі з рабочымі і г. д. У некаторых ячэйках ня было створана шырокае грамадзкае думкі наўкола перавыбараў.

З. Ч.

Што паказала абсьледаваньне калгасаў

АДНОСІНЫ СЯЛЯНСТВА ДА КАЛГАСАЎ

Калектывізацыя вёскі, якая набыла ў апошні час масавыя разьмеры, сустракае на сваім шляху то няпрыміручых праціўнікаў—кулакоў, то прыхільнікаў—бяднякоў-сярэдняцкі пласт вёскі. Усё большае згуртоўваньне вакол калгасаў бяднякоў-сярэдняцкіх пластоў вёскі, разьвіцьцё калектыўных гаспадарак—усё гэта сустракае варожыя адносіны з боку кулацтва.

Адносіны вакольнага насельніцтва да калектываў можна характарызаваць наступным чынам: там, дзе калгас рацыянальна вядзе сваю гаспадарку, засявае чыстым насеньнем, дзе жывёла абслугоўваецца племяннымі прадуктарамі калгасу, дзе ўраджайнасьць вышэй сялянскай—там адносіны станоўчыя і калгас карыстаецца аўтарытэтам.

Пераважная колькасьць членаў калгасаў навербавана з бяднякоў-сярэдняцкіх пластоў, пры нязначным процанце аможнікаў. У большасьці сваёй калгасы маюць невялікую пасеўную плошчу. З 611 калгасаў 588 маюць да 150 гэктараў пасеву, звыш-жа 150 гэктараў—толькі 23.

АГРАМАДЖАНЫЯ КАПІТАЛЫ

Аграмаджаныя капіталы ў калгасах нязначныя і складаюцца галоўным чынам з будынкаў і маемасьці, атрыманых ад дзяржэммаемасьці. На 1-га чэрвеня 1928 г. па 611 калгасах агульная сума аграмаджанага капіталу складала звыш 4 мільёнаў, з якіх атрымана каштоўнасьцей ад дзяржэммаемасьці на 3,5 млн. руб. Такім чынам, унутры калгасных налічэньні складаюць якіх-небудзь поўмільёна рублёў.

Трэба ўвесьці, як правіла, каб скідкі па сельгасадатку і іншыя ільготы залічваліся-б у аграмаджаны капітал і каб наогул такія адлічэньні рабіліся кожны год у больш буйных разьмерах, чым гэта рабілася да гэтага часу.

Даныя абсьледаваньня паказваюць, што па 491 калгасах адлічана ў аграмаджаны капітал са скідак па сельгаспадатку 35.000 руб., што складае ўсяго 0,8 проц. ад усяго аграмаджанага капіталу і з прыбыткаў 270.000 руб. (што складае ад усяго аграмаджанага капіталу 6,7 проц.).

Пры гэтым з 599 калгасаў, якія далі паказаньні аб аграмаджаным капітале, **108 зусім ня маюць аграмаджанага капіталу.** Толькі 21 калгас мае аграмаджанага капіталу на суму 31.000 руб.

Ёсьць калгасы, у якіх заработак членаў дасягае 80 руб. у месяц і вышэй, а адлічэньні ў аграмаджаны капітал зусім нязначныя.

КРЭДЫТЫ СКАРЫСТОЎВАЮЦЦА НЕ ПА ПРЫЗНАЧЭНЬНІ

Побач з гэтым нагледзецца ненармальнасьць у скарыстаньні атрымліваных крэдытаў. Апошнія выдаткоўваліся не заўсёды па прызначэньні і нават разьмяркоўваліся паміж членамі калгасу. Тут выяўляецца патрэбнасьць пры выдачы крэдытаў браць з калгасу спэцыяльнае абавязальства аб выдатканьні крэдыту толькі на тыя патрэбы, на якія ён выдан.

Пры выдачы крэдытаў на пабудову жыльлёвых будынкаў трэба выпрацаваць тыповыя пабудовы і абавязаць калгас (асабліва гэта датычыць камун), будаваць у дамох агульную кухню, што вельмі дапамагала-б аграмаджаньню хар чаваньня і дало-б магчымасьць жанчыне прыняць удзел у гаспадарчым і культурным жыцьці калгасу.

Сума крэдытаў, што адпускаецца на набыцьцё жывёлы і разьвіцьцё жывёлагадоўчага ўхілу ў калгасе, яўна невысталчальная. Трэба павялічыць таксама крэдыты на куплю канцэнтраванага корму.

ПРАЦЭС АГРАМАДЖАКЬНЯ МАЕМАСЬЦІ

У 611 калгасах на 1-га чэрвеня 1928 г. кошт усіх сродкаў вытворчасьці (жывёлы, птушак, пчол, інвэнтару, гаспадарчых і прамысловых будынкаў) складаў 5.240.000 руб.—з іх калектыўных 83,0 проц. і індывідуальных 17 проц.

Цяжэй за ўсё аграмаджваецца жывы інвэнтар, асабліва дробная жывёла. Таму, пры аграмаджаньні жывёлы трэба старацца замяніць жывёлу некаторых членаў калгасу лепшай. Апрача палепшэньня народ жывёлы, гэтым будуць вынішчаны ўласьнікіцкія тэндэнцыі і разлады, што ствараюць вакол аграмаджанае жывёлы. Трэба таксама ўстанавіць, каб увесь прыплод ад жывёл паасобных членаў лічыўся ўласнасьцю калгасу.

ТОЕ, ШТО ТРЭБА НЕАДКЛАДНА ЗЬНІШЧЫЦЬ

Вялікі адмоўны ўплыў на гаспадарчае жыцьцё і далейшае разьвіцьцё калгасу маюць **свяцкія** адносіны паміж асобнымі членамі. У тых калгасах, дзе некалькі сем'яў зьвязаны сваяцтвам, асабліва яскрава наглядаецца разлады, канчваюцца і да будаўніцтва прыступлена ўжо з гэтага году.

Пералічаныя намі работы далёка не ахапляюць усіх работ Хэмбуду па праектаваньні новых і пашырэньні старых заводаў. З бягучага году Хэмбуд прыступіў да праектаваньня хэмічнае апаратуры і арганізаваў будаўніча-мантажнае кіраўніцтва, каб у будучым ня толькі выконваць праекты заводаў і весьці нагляд за будаўніцтвам, але таксама і ажыцьцяўляць яго.

ХЭМСЫНДЫКАТ

Хэмсындыкат апошні час зварачае вялікую ўвагу на арганізацыю тэхнічна-хэмічнае прапаганды, выданьне папулярных лістовак і ўжываньне тых ці іншых хэмпрадуктаў, навукова-папулярных плякатаў, каротка-мэтражных фільм, і пасылкі на месцы інструктароў для работы па розных тэхнічных пытаньнях, непасрэдна сярод насельніцтва.

Асабліва шырокая зацікаўленасьць была выклікана лістоўкамі аб сродках барацьбы са шкодлікамі і аб мэтадах пабелкі тканін хлёрнай вапнай. Хэмсындыкат атрымаў рад запытаньняў з месц і патрабаваньняў на ідэсактысцы (сродкі барацьбы са шкодлікамі). У дадатак да лістовак выдаюцца плякаты, галоўная задача якіх растлумачыць пры дапамозе самых простых чарцяжоў структуру таго ці іншага прыбору, напрыклад, для абеззаражаньня вады праз хлёрную ванну ў хатняй абстаноўцы.

Вельмі сур'ёзная значэньне надае Хэмсындыкат выпуску каротка-мэтражных фільм. У сучасны момант выпушчана і разаслана па вёсках кіна-фільма «Хлорпікрын у барацьбе са шкодлікамі». Рыхтуецца да выпуску фільма: «Барацьба з мышамі і пацукамі».

Накіраваньне інструктароў на месца таксама зьяўляецца надзвычайна важным фактарам у пытаньні тэхна-хэмічнае прапаганды. Была зроблена практыка дэманстрацый сялянам спосабу пабелкі хлёрнай вапнай тканін іх уласнага вырабу. У выніку цэлыя вёскі пакі

ДЭЙНАСЬЦЬ ХЭМІЧНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ І ЎСТАНОЎ

ХЭМБУД

Работа Хэмбуду па праектаваньні новых і пашырэньні існуючых хэмічных заводаў разгортваецца ў межах пяцігодкі ўсё шырэй.

Асабліва шмат зроблена па асноўнай хэмічнай прамысловасьці і ў прыватнасьці на серка-кіслай, тукавай, сынтэтычнага аміяку і зьвязаных з ім вытворчасьцяй. У пэрыядзе папярэдняга тэхна-эканамічнага згуртаваньня знаходзяцца такія гіганты-камбінаты, як Днепрабуд, Магнітагорскі, Багамолаўскі, Ленінградзкі і Сталінградзкі, якія ацэньваюцца у некалькі соцень мільёнаў р. Каб даць уяўленьне аб грандыёзнасьці гэтых камбінатаў, накажам на прыклад двух камбінатаў: Бярэзьнікаўскага і Маскоўскага, якія ўжо прайшлі стадыю папярэдняга згуртаваньня і знаходзяцца часткова ў станцыі эскізнага праектаваньня і часткова ў разгортваньні будаўніцтва. Будаўніцтва Бярэзьнікаўскага камбінату ацэньваецца ў 112 міл. руб.

Ня менш магутнымі праектуюцца камбінаты Магнітагорскі, коксабэнзольны, кіслотны і тукавы; Багамолаўскі з серкавай кіслатой з адыходзячых газаў канвэртараў пры плаўцы медзі і на флётацыйным калчадане з радам заводаў аміяку і тукаў на аснове таннае кіслаты, Днепроўскі з яго грандыёзнай электрастанцыяй, якая дае магчымасьць арганізаваць магутныя заводы аміяку, а таксама тукаў.

Для здавальненьня патрэбнасьці іншай прамысловасьці і асабліва апіла-фарбавальнай, нафтавай, жалезаапрацоўчай, віскознай і тэкстыльнай часткова закончаны і часткова заканчваюцца праекты заводаў кантактнай серкавай кіслаты і апаратаў Кесьлера ў Канстатынаўцы, Дарагамілаве, Чарнарэчны і інш.

Не забыты і існуючыя камбінаты, як Ніжэгарадзкі, Пермскі, Канстанцінаўскі і паасобныя заводы ў Адэсе, Віньніцы і на Урале, хэмічная прамысловасьць якіх атрымлівае магчымасьць разьвіцця на падставе новых і пашы

На Савецкай Беларусі

Праезд удзельнікаў вялікага матацыклетнага прабегу

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Учора праз Гомель праехалі ўдзельнікі матацыклетнага прабегу Масква—Крым—Масква. Матацыклісты суустракалі члены ячэек аўтадору. На стадыёне адбыўся вялікі мітынг.

Адпачываць у сераду

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Агульны сход вайскова-служачых № кавалерыйскай дывізіі і акрваенкамату пастанавіў замест надзелі адпачываць па серадах (першы дзень Кастрычніжавай рэвалюцыі)

Падрыхтоўка батракоў у вайсковыя школы

ВОРША. (Наш кар.). У акрузе арганізуюцца курсы па падрыхтоўцы батрацкай моладзі ў вайсковыя школы. Адрыванням асыгнаваў на гэту мэту 500 р.

У камісіі па вярбоўцы ў вайсковыя школы паступіла многа заяў ад батрацкай моладзі.

Пастановы зьезду саветаў —у масы

ВОРША. (Наш кар.). З 20-га чэрвеня ў акрузе пачнецца кампанія папулярызацыі пастаноў 5-га ўсесаюзнага, IX ўсебеларускага і III акруговага зьездаў саветаў сярод рабочых і сялянства. Гэтыя пастановы будуць абгаворвацца на пленумах саветаў і на сходах рабочых і сялян, а таксама яны будуць прапрацаваны на пасяджэньнях секцый і камісій саветаў.

Сэзоньнікі купляюць аблігацыі

МАЗЫР. (Наш кар.). Сярод сэзоньнікаў-будаўнікоў пачалося распаўсюджаньне другой пазыкі індустрыялізацыі. Пачатак зрабілі рабочыя будаўніцтва гарадзкой амбулаторыі. Невялікая колькасьць сэзоньнікаў падпісалася на 500 р.

На дапамогу ахвярам сацыял-цэргібэлеўшчыны

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Рабочыя Гомелю працягваюць збор адлічэньняў на карысьць ахвяр першамайскага расстрэлу рабочых у Бэрліне. Акругком МОПР'у дадаткова перавёў ЦК

Арганізуецца 66 калгасаў

Зямляўпарадкаваньне на Бабруйшчыне

БАБРУЙСК. (Наш кар.). На акрузе пачаліся зямляўпарадкаваўчыя работы. На рабоце па правядзеньні зямляўпарадкаваньня ўжо заняты 81 штатны каморнік, 17 часовых і 17 практыкантаў. У хуткім часе прыедзе яшчэ 18 спэцыялістых з сельска-гаспадарчай акадэміі.

За летні час па ўсёй акрузе мяркуецца зямляўпарадкаваць плошчу ў 90 тысяч гэктараў. Наркамзем-жа вызначыў плошчу для зямляўпарадкаваньня ў Бабруйшчыне ў разьмеры 125 тысяч гэктараў. Для выкананьня заданьня Наркамзему не хапае прыблізна 28 зямельных спэцыялістых.

Знойдзена цела забітага селькора

МАЗЫР. (Наш кар.). Некалькі месяцаў назад на старонках «Зьвязды» паведамлялася аб забойстве у Азарычыцкім раёне селяніна актывіста-селькора СЯНЬКО. Справа зацягвалася ў зьвязку з тым, што не знайшлі цела забітага. Надаўна труп Сянько быў знойдзен у рэчцы і ўстаноўлена, што яго забілі і кінулі ў прарув.

19 чэрвеня у Азарычы выязджае сэсія акруговага суда для разгляду на месцы справы аб забойстве Сянько.

Пакражы ў чэргах у Дзяржбанку

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). У пачатку гэтага году выяўлены рад пакраж у чэргах ля кас Дзяржбанку. У касіра працгандлю владзеі пакралі 1500 р., у касіра мэтпрому — 3.000 р. Па справе затрыманы 2 владзеі —гаспадлёры Цыклер і Грынштэйн. Суд прыгаварыў абодвых да 2-х год пазбаўленьня волі і да высылкі пасьля адбыцьця пакараньня на 3 гады ў

Да чысткі падрыхтаваліся

ЧЭРВЕНЬ (наш кар.). Раённая камісія па чыстцы савецкага апарату падагуліла папярэдняя вынікі правядзеньня падрыхтоўчай работы.

Камісія правяла 23 сходы па вёсках, саўгасах, калгасах і мястэчках, на якіх былі зроблены даклады аб чыстцы савецкага апарату і задачах барацьбы з бюракратызмам. У раёне арганізавана 10 рабочых брыгад, якія абсьледавалі 6 устаноў.

У Чэрвені арганізуюцца курсы для падрыхтоўкі вылучэнцаў для работы ў савецкім апараце.

Заможнікі супроць беднаты

(Касьцюковіцкі раён, Магілеўшчына)

Сход беднаты в. Бонь, Касьцюковіцкага рабну скіраў для абгаварэньня пытаньняў па с.-г. падатку.

Уважліва абгаварвае сход сьпіс гаспаларак, якія маюць правы на льготы. Ніхто ня супярэчыць, што трэба вызваліць ад падатку ўсіх удоў-бядняцак і ўсе іншыя маламоцныя гаспадаркі.

Але знайшліся больш заможныя гаспадары трапіўшыя на сход, якія выступілі супроць аслабаненьня ад падатку бедноты.

Пры абгаварэньні сьпісу заможных гаспадарак, якія трэба ападаткаваць у індывідуальным парадку, беднота праявіла актыўнасьць, расказаўшы хто ў каго працаваў і якія заможнікі давалі зімой хлеб па адработах.

М. Р.

Сельсаветчыкі пакрываюць утойшчыкаў

(Касьцюковіцкі раён, Магілеўшчына)

Заможная вёска Разрытая (Смольскага сельсавету) у пачатку вучоту аб'ектаў абкладаньня імкнулася ўтаіць аб'екты абкладаньня с.-г. падаткам. Заможнікі схавалі шмат жывёлы і невялікробчых заработкаў. Калі была зроблена праверка высьвятлілася, што 10 гаспадароў схавалі ад вучоту 18 сьвіней і некалькі авечак. Члены сельсавету ў гэты час трымаліся моўчкі.

Няхай будзе соромна

На варце СССР

Баявое прывітаньне

З наступнага тыдню ў Менску пачынае выходзіць беларуская сялянская вайсковая газэта «На варце».

Рэвалюцыйны Вайсковы Савет БВА, Палітычная Ўправа Акругі і рэдакцыя газэты «Чырвонаармейская Праўда» паслалі баявое прывітаньне новай газэце і яе чытачом.

Адказныя задачы стаяць цяпер перад вайсковаю газэтай для сялян.

Гэта газэта павінна стаяць сапраўды **на варце** межаў савецкіх рэспублік, на варце сацыялістычнага будаўніцтва.

«На варце» павінна асьвятляць на сваіх старонках міжнародныя падзеі, буржуазія, прыкрываючыся мірнымі словамі, на справе ўсё ўзбройваецца да зубоў, рыхтуецца да новых баёў, тэрэ павуціньне таемных дагавароў і згод.

Ваннізацыя рабочых і сялянскіх мас Беларусі—вось асноўная задача газэты «На варце». Трэба, нарашце, пакласьці канец маруднасьці, бязьдзейнасьці, сэнлівасьці нізавых асоавіяхімаўскіх ячэек. Трэба разварушыць, ажывіць, зрабіць сапраўды масавую работу на баявой падрыхтоўцы працоўнага насельніцтва Савецкае Беларусі.

Мэтад **сацыялістычнага спаборніцтва** павінен быць скарыстаны і ў рабоце па ваннізацыі і тэрытарыяльным будаўніцтве. «На варце» павінна ўцягнуць пераменьнікаў у сацыялістычнае спаборніцтва па баявой вучобе і міжзборавай рабоце.

«Пераменьнікі—ў калгасы!»—гэты лёзунг павінна высунуць і падтрымліваць газэта «На варце». Яна павінна растлумачваць тэрскладу нашых часьцей і сялянству лінію ленінскай кампартыі і савецкай улады ў справе наступленьня на нашага клясавага ворага.

Байцы ВВА памятаюць гэраічную барацьбу беларускага сялянства ў пяжкія дні грамадзянскай вайны. Яны ведаюць, што нашы буржуазныя суседзі ўсё яшчэ вострыць зубы на нашы палі і заводы, яны ведаюць, што рабочая кляса і сялянства БССР пад кіраўніцтвам партыі Леніна будуць заўсёды гатовы да адпору ворагу, будуць заўсёды на варце.

Б.

Першая трывога

(Ворша №-ы полк)

Гадзіна ночы... 16 чэрвеня. У лягеры сьпяць... Цішыня. Выразна даносіцца бой гарадзкога гадзіньніка, ды перакліку птушак, разьмесьцілушыхся тут-жа побач, над белымі палатнянымі хаткамі, на старых стагодніх соснах. З палатак вырываецца храп чырвонаармейцаў. Больш ні гуку. Ціха ў палатняным гораддз

ЛІСТОК РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ІНСПЭКЦЫІ

АПАРАТ—ПАД АГОНЬ КРЫТЫКІ МАС!

Сёньня пачынаецца чыстка ЦСУ

УСЕ, ДЛЯ КАГО ДАРАГІЯ ІНТАРЭСЫ КРАІНЫ, ХТО МОЖА ДАПАМАГЧЫ КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ,— УСЕ НА СХОДЫ ПА ЧЫСТЦЫ ЦСУ

Як-жа працуе ЦСУ

Статыстыка заклікана абслугоўваць плянавае будаўніцтва народнае гаспадаркі. З кожным годам статыстыка набывае ўсё большае і большае значэньне, яна служыць базаю для пабудовы гадовых, пяцігадовых і генэральных плянаў народнае гаспадаркі. Чым больш дакладна мы будзем улічваць зьявы грамадзкае, гаспадарчае і дзяржаўнае дзейнасьці нашае краіны, тым лепш і з меншымі памылкамі, а мо' і зусім без памылак, нашы пляны будуць адлюстроўваць сапраўднасьць.

Значэньне статыстыкі зараз ужо зразумелі ня толькі людзі, што блізка стаяць да гэтае справы, але і шырокія масы працоўных. Так, напрыклад, на фабрыках і заводах рабочыя блізка пачалі падыходзіць да разуменьня статыстыкі. Рабочыя брыгады, што робяць абсьледваньне дзейнасьці ЦСУ ў сувязі з чысткаю апарату, пра гэта ня раз заяўлялі.

За мінулыя гады статыстыка займалася больш за ўсё кан'юнктурнымі задачамі. Апрача таго, ахват росту работ быў вельмі грамоздкі, часта распрацоўкі матар'ялаў пазьніліся і ў выніку гэтага, мала скарыстоўваліся для практычных мэт. Амаль не зварачалася ўвагі на аграмадканы сэктар народнае гаспадаркі. Ня было выстарчальнай увязкі з ведамствамі.

Зараз, калі зацьверджан пяцігадовы плян разьвіцця народнае гаспадаркі, статыстыкам таксама прыходзіцца прапрацаваць пяцігадовы плян у галіне статыстыкі. Саўнарком Беларусі даручыў ЦСУ скласьці сводны пяцігадовы плян дзяржаўнае статыстыкі з тым, каб у ім знайшлі сваё адлюстраваньне, найактуальнейшыя праблемы нашае гаспадаркі. Цяпер нельга ўжо абмежавацца толькі зьбіраньнем і статыстычным афармленьнем матар'ялаў. ЦСУ павінна даць аналітычныя і сынтэтычныя работы і як заканчэньне ўсёй нашай дзейнасьці, да канца пяцігодкі скласьці баланс народнае гаспадаркі. Гэта работа дасьць магчымасьць цалкам і поўнасьцю паказаць малюнак становішча нашае гаспадаркі і культурнага будаўніцтва. Тады мы зможам праверыць, як выконваюцца нашы пляны, як працуюць нашы гаспадарчыя і дзяржаўныя органы і можам прадбачыць пляны на будучую пяцігодку.

Адгэтуль з поўнай відавочнасьцю вынікае задача ўзмацненьня статыстычных органаў самымі лепшымі кваліфікаванымі сіламі, якія пічыра будуць аддаваць свае веды і працу пралетарскай дзяржаве.

Калі паглядзець на стан апарату ЦСУ ў даны час, дык трэба прысьці да вываду, што ён слаба ўкамплектован навуковымі і кваліфікаванымі сіламі, ён моцна засьмечан, ёсьць і элемэнты, якія ня могуць прынесьці для справы сапраўднае карысьці. У апараце ЦСУ магчымы выпадкі шкодніцтва: досыць у статыстыцы няправільна паказаць тую ці іншую зьяву ў нашай краіне і гэта прынясе шкоду дзяржаве. Апарат ЦСУ каштуе вельмі дорага і трэба сьмела паставіць пытаньне: ці дае статыстыка тое, чаго ад яе патрабуюць?

Зараз праводзіцца чыстка ЦСУ. Яна павінна адказаць на пытаньні: як працуюць органы дзяржстатыстыкі, з чым яны не спраўляюцца, якія задачы стаяць па палепшаньні работы статыстычнага апарату, хто з працаўнікоў неадпавядае свайму прызначэньню, каго трэба зусім аслабаніць ад статыстыкі, каго трэба замяніць і каго трэба скарыстаць на ніжэйшых і вышэйшых пасадах. Чыстка павінна адказаць на пытаньне, якім чынам павінны мы папаўняць статыстычныя органы вылучэнцамі з рабочых і сялян? Чыстка павінна даць нарэшце кірунак для будучае дзейнасьці.

РСІ праводзіць надзвычайна адказную, складаную і крапатлівую работу. Шырокая грамадзкасьць у гэтай рабоце ідзе на дапамогу РСІ. Але ўсяго гэтага пакуль што яшчэ мала.

Камісія па чыстцы ЦСУ зварачаецца да шырокіх мас працоўных з просьбай дапамагчы ёй у гэтай складанай справе, паказаць ёй недахопы, направіць памылкі і выявіць сапраўды лішніх і непатрэбных людзей у апараце ЦСУ.

Ленін надаваў статыстыцы выключна важнае значэньне, ён сказаў, што «сацыялізм,—гэта вучот». Мы ў нашай краіне будуем сацыялізм, значыцца мы павінны пакланаціцца, каб органы на правядзеньні вучоту адказвалі-б тым вялікім задачам, якія стаяць перад намі па будаўніцтву сацыялізму.

БЯЗ „ВІНЫ" ВІНАВАТЫЯ

або аб тым, як ЦСУ выконвае часам дырэктывы

(Па матар'ялах абсьледваньня НК РСІ)

Пастановай ураду і НК РСІ аб рэарганізацыі статыстычнага апарату ў 1927 г. ЦСУ было дана рад новых правоў і унесена рад прапаноў аб палепшэньні работы статыстычнага апарату. Паглядзім, як гэтыя дырэктывы выконваюцца ў непасрэднай рабоце ЦСУ.

„Чыталі"... з прыемнасьцю

Узяць хаця-б пастанову калегіі НК РСІ Бел. ад 6/V 1927 г., дык па атрыманьні апошняй былы намесьнік кіраўніка ЦСУ налажыў рэзалюцыю: «азнаёміць загадчыкаў сэктарамі». Апошнія расьпісаліся на пастанове, што «чыталі» і на гэтым арганізацыйны бок выкананьня пастановы НК РСІ скончыўся. Далейшага руху, азнаямленьня масы супрацоўнікаў пастанова не атрымала. Цікава адзначыць, што ў канцы 28 г., калі НК РСІ зноў абсьледваў ЦСУ, дык з вялікімі цяжкасьцямі ўдалося знайсьці гэту пастанову ў натрах ЦСУ і то пры дапамозе атраду «лёгкай кавалерыі» пасьля трохдзённага шуканьня.

Ня так зразумелі

Пастановамі ўраду і НК РСІ ЦСУ было працанавана ўзяць курс на дэцэнтралізацыю статыстычных распрацовак. ЦСУ адразу пасьпяшылася ў 1928 г.... цэнтралізаваць рад распрацовак, нават такіх, якія да пастановы ўраду былі ў акр. стыстыстычных бюро, як, напр., суцэльны вучот гандлёвых прадпрыемстваў, вясеньне апытаньне і інш.

Справа з цэнтралізацыяй—сумная справа, бо «дзякуючы» цэнтралізацыі паказаных работ, яны атрымаліся пізкай якасьці, значна спазьнілася, а па вучоце гандлёвых прадпрыемстваў увесь матар'ял прышлося накіраваць акрстатбюро для выпрацаваньня. Гэта, папершае, падругое цэнтралізацыя статыстычных распрацовак наогул не дае магчымасьці акруговым органам мець неабходныя лічбовы матар'ял у сваёй практычнай працы пры разьвязваньні раду пытаньняў эканамічнага і культурнага будаўніцтва. Паміж тым пашырэньне правоў візавога савецкага апарату і ажыўленьне іх работы цягне за сабой яшчэ большыя патрабаваньні ў статыстычных матар'ялах.

Акруговыя статыстычныя органы гэтыя патрабаваньні ня могуць задаволіць, бо большасьць распрацовак цэнтралізавана. Гэта, прымушае мясцовыя органы рабіць самастойна вучот, а таксама націскаць на акрстатбюро, якія вымушаны некаторыя распрацоўкі рабіць, не гледзячы на цэнтралізацыю. Зразумела, што ўсё мясцовыя статыстычныя падлікі распрацоўкі выпадаюць са сферы мэтадалёгічнага ўплыву ЦСУ, яны робяцца бяз сыстэмы, значна горш, часам мэтадалёгічна нявытрымана, што дрэнна адбіваецца на якасьці матар'ялаў і тым самым па якасьці мясцовага плянаваньня і рэгуляваньня. Акруговыя органы ня раз аб гэтым гаварылі, пісалі, часам літаральна «вапілі», але ўсё гэта заставалася «голосом вопиющего в пустыне». ЦСУ адпачывала на лаўрах і толькі ў апошні час пагледзецца некаторы зрух у гэтым пытаньні, калі акрстатбюро пераданы некаторыя распрацоўкі (вучот дазволаў на будаўніцтва, кан'юнктурны вучот цэнзавай прамысловасьці).

Іван ківае на Пятра

Возьмем другі прыклад. Пастановай ураду па дакладу НК РСІ органам ЦСУ дана права «нагляду, мэтадолёгічнага інструктаваньня работы ведамственай статыстыкі, а таксама права даны спэцыяльных абавязковых для ўстаноў дырэктыў у галіне мэтадалёгіі і тэхнікі статыстычных работ». Функцыі гэтыя павінны былі быць зьдзейсьнены Статплянам і яго навуковым сакратарыятам. Статплян быў арганізаваны ў сакавіку 1928 г., на працягу ўсяго году меў толькі 4 пасяджэньні, прычым аб ведамственай статыстыцы пытаньне абмяркоўвалася толькі адзін раз (11/IV 1928 г.) і была прынята пастанова: «прасіць Калегію ЦСУ ўзмацніць нагляд за работай ведамственай статыстыкі».

Калегія ЦСУ аб ведамственай статыстыцы таксама мела «суждение» (за 1928 г.) два разы (13/III і 13-IV-28 г.), прычым пастановлена аб неабходнасьці «узмацненьня ролі Статпляну, як органу мэтадалёгічнага кіраваньня, узмацненьня інспэктарскага нагляду ЦСУ за ведамствамі».

Гэтым выкананьне важнейшай дырэктывы ўраду абмяжоўвасьца, прычым трэба дадаць, што і гэтыя пастановы самое ЦСУ далей пратаколу не пайшлі і атрымалася, урэшце, што Іван (Статплян) ківаў на Пятра калегію ЦСУ) а Пятро на Івана і ківаюць, мабыць, да гэтага часу.

Статплян і яго камісіі

Каб некалькі «разгрузіцца» ад работы на пагляд'зе і інструктаваньні ведамственай статыстыкі, Статплян утварыў статплянавыя камісіі пры асобных сэктарах, але і апошнія амаль што нічога ў гэтай галіне, не рабілі за выключэньнем раду выпадкаў разгляду статыстычных форм ведамстваў, але і гэта рабілася пад націскам НК РСІ на гэтыя ўстановы, бо інакш НК РСІ не зацьвярджаў форм.

Акрстатбюро ў гэтай галіне таксама нічога не рабілі, дый рабіць нічога не маглі, бо ніякх указаньняў наконт гэтага ад ЦСУ ня мелі.

Адну з сваіх галоўнейшых функцый на складаньні зводнага пляну статыстычных работ Статплян таксама выконвае неадвальніюча: статыстычнага работы ведамстваў уключаюцца ў зводны плян мэханічна, без належнага аналізу зьместу гэтых работ, і ў зводных плянах работ на 27-28 г. і 28-29 г. можна знайсьці амаль што аналёгічныя работы як па пераліку ЦСУ, гэтак сама і па пераліках ведамстваў. Напрыклад, кан'юнктурны вучот па зваротах спажывецкай кааперацыі, кан'юнктура цэнзавай прамысловасьці і інш., чым парушаецца самы сэнс складаньня зводных плянаў.

Пляны работ ня ўключаюць мясцовых статыстычных работ акр. стат. бюро і інш. органаў і думкі месц зусім мала ўлічваюцца і недарма на сваім пасяджэньні ад 27/VIII 1928 г. Полацкі Акрплян адзначае: «што пералік работ на 28-29 г. зусім не прадугледжвае тых заўваг, зробленых акрплянам па пляне работ ЦСУ на 27-28 г. і якія таксама амаль што ня мелі адбітку ў пляне ЦСУ на 28-29 г.» Аналёгічнае адзначаецца і іншымі акрплянамі. Такім чынам, пасылка пляну на абмеркаваньне месц зьяўляецца як быццам толькі «дапінай эпосе», але без практычных вынікаў.

З усяго прыведзенага можна выразна бачыць, як ЦСУ выконвае важнейшыя дырэктывы ўраду і НК РСІ.

За гэткае выкананьне, як кажуць, па галоўцы не пагладзяць.

Ян.

Як ЦСУ абслугоўвае ведамствы

Лепш прыстасавацца да патрэб устаноў

За апошнія гады абслугоўваньне ЦСУ патрэб цэнтральных ведамстваў БССР ці, інакш кажучы, скарыстаньне ведамствамі статыстычных матар'ялаў ЦСУ некалькі палепшылася, але вельмі ў нязначнай ступені. Узьнікае гэта ў значнай меры ад таго, што распрацоўкі статыстычных матар'ялаў робяцца ЦСУ па формах і праграмах ЦСУ СССР, якія мала дапасаваны да патрэб нашых ведамстваў. **Большая частка статыстычных матар'ялаў нашымі ведамствамі мала скарыстоўваецца ў сваёй штодзённай практычнай дзейнасьці і нават для складаньня кантрольных лічбаў прыходзіцца прарабляць вялізную работу па пераліках розных лічбаў.**

Тое самае адносна іншых распрацовак, напрыклад, на кан'юнктуры цэнзавай прамысловасьці, формы ўладаньня для дзяржпляну БССР распрацоўваюцца на групы: прадпрыемствы ВСНГ, камунальныя і іншыя дзяржаўныя, а для ЦСУ СССР на групы саюзнага значэньня, рэспубліканскага, наркамацкага і мясцовага. І так па радзе работ.

Гэта значыць, што прыходзіцца рабіць падвойную работу. Але яшчэ горш з тэрмінамі. Часта весткі распрацоўваюцца ЦСУ значна пазьней тых тэрмінаў, калі гэтыя весткі патрэбны ведамствам і калі гэтыя весткі ў поўнай меры трацяць сваё значэньне і ня могуць быць скарыстаны для аналізу тых ці іншых працэсаў народнай гаспадаркі, ці ў практычнай дзейнасьці ўстаноў. Напрыклад, гадавое абсьледваньне прамысловасьці па бланку «Б», дынамічныя абсьледваньні с.г., бюджэтныя, вучот гандлёвых прадпрыемстваў і інш.

На дрэннае абслугоўваньне ведамстваў статыстычнымі весткамі і скарыстаньне апошніх мае таксама ўплыў невыстарчальнае і несвячасовае апублікаваньне статыстычных матар'ялаў і невыстарчальнае абвяшчэньне зацікаўленых ведамстваў аб тых матар'ялах, што ёсьць у органах ЦСУ.

У галіне палепшэньня абслугоўваньня ведамстваў статыстычнымі матар'ялямі ЦСУ трэба будзе прарабіць значную работу, бо, ня гледзячы на аб'ектыўныя ўмовы, шмат чаго можна было-б зрабіць. Але адсутнічала належная ініцыятыва і жаданьне.

Правая ня ведае, чаго хоча левая

Калі адносна абслугоўваньня ведамстваў, наогул можна спасылацца на аб'ектыўныя ўмовы, каб выратаваць сваё становішча, дык у адносінах пастаноўкі абслугоўваньня патрэб ведамстваў, статыстыка якіх перадана (пастановай ураду пры рэарганізацыі ЦСУ у 27 г.) у ЦСУ, дык тут ніякіх спасылкі ня выратуюць. А становішча абслугоўваньня гэтых ведамстваў патрабуе самае сур'ёзнае ўвагі, бо кульгае яно на «ўсе чатыры».

Цалкам перададны ЦСУ пастановай ураду статыстыка Наркамасьветы, Наркам. Аховы Здароўя, Наркампрацы, Наркамюсту і часткай статыстыка іншых ведамстваў.

Вельмі неахвотна выконвала ЦСУ дырэктывы ўраду, ня раз тыя ці іншыя спрэчныя пытаньні аб перадачы статыстыкі бясконца разважаліся НК РСІ БССР. Характэрна таксама, што на працягу 1927-28 г. ЦСУ некалькі раз ставіла пытаньне аб перадачы статыстыкі назад ведамствам, прычым кожны раз думкі ЦСУ мяняліся, і, напрыклад, у лістападзе 27 г. і красавіку 1928 г. ЦСУ лічыла нямэтазгодным перадачу яму статыстыкі Наркампрацы і Наркамасьветы, рэгістрацыю цэн на будаўнічыя матар'ялы, статыстыку выбарчай кампаніі (з дакладу ЦСУ «аб дзяржаўнай статыстыцы БССР, стар. 2 і пратакол пасяджэньня савету ЦСУ ад 9-IX 27 г. № 5 параграф 2) і тут-жа «пчыра» абараняліі правільнасьць перадачы ім статыстыкі Наркам. Аховы Здароўя (пратакол Савету ЦСУ ад 9-IX—27 г. № 5 параграф 5), а ў другім дакуманце (матар'ялы камісіі, вылучанай камісіяй ЦСУ па абсьледваньні сэктару сацыяльнай статыстыкі ад 25-V 28 г.) нават пішуць: «...перадана Наркам. Аховы Здароўя ўсёй апэрацыйна-статыстычнай справаздачнасьці была-б мерай недабачлівай...».

Іншая думка пануе ў ЦСУ у 1929 г.: зараз ЦСУ ўжо не дамагаецца перадачы ў Нарком. Аховы Здароўя статыстыкі па ахове здароўя і зусім няма гутаркі аб статыстыцы Наркамасьветы і Наркампрацы. Тут цікава адзначыць характэрную рыску: прапановамі па абсьледваньні ЦСУ (зробленага НК РСІ Беларусі ў канцы 28 г.) прадугледжана арганізацыя лепшага абслугоўваньня Наркам. Аховы Здароўя з боку ЦСУ, шляхам вылучэньня адпаведнай колькасьці працаўнікоў, якія тэрытарыяльна павінны працаваць у Наркам. Аховы Здароўя, а таксама заключэньне адпаведнага дагавору паміж ЦСУ і Наркам. Аховы Здароўя. Гэта прапанова была абмеркавана грамадзкімі арганізацыямі ЦСУ і камісіяй ЦСУ і была прынята, але 27-га мая 1929 г. ЦСУ зноў абудзілася і піша ў НК РСІ, што яна «ня можа згадзіцца з параграфам 26 пастановы калегіі НК РСІ Беларусі ад 21-III—1929 г....» па гэтым пытаньні.

Трэба пашавяліць мазгамі

З усяго паказанага можна лёгка сабе ўявіць, як арганізавала ЦСУ абслугоўваньне гэтых ведамстваў статыстычнымі весткамі.

Абслугоўваньне гэта, як ужо сказана вышэй, вельмі дрэннае і патрабуе ад ЦСУ ўпартай работы па яго палепшэньні, а таксама ўпартага змаганьня з тымі шкоднымі настроямі, якія патрабуюць новай перадачы статыстыкі ведамствам замест таго, каб пашавяліць мазгамі і належным чынам арганізаваць работу, бо некаторыя ведамствы прымушаны былі фактычна вярнуцца да ранейшага становішча і зноў арганізаваць роўнапалежнае зьбіраньне статыстычных вестак (як Наркамасьветы).

Пры дапамозе грамадзкасьці трэба спадзявацца, што ЦСУ ўдасца перамагчы ў гэтай галіне і вывяць тых, хто шкодзіць, або не жадае дапамагчы ў належнай арганізацыі работы.

БРЫГАДЗІР

ЖЫВЫЯ „ТАРМАЗЫ" У АПАРАЦЕ ЦСУ

Камісія па чыстцы апарату ЦСУ павінна заглянуць у санітарную і дэмаграфічную сэкцыі гэтай установы. Тут камісія знойдзе для сябе шмат цікавага матар'ялу. Камісія сустрэнецца ў гэтых сэкцыях і з бюракратызмам, і з нядбайнымі адносінамі да работы в боку цэнзага раду супрацоўнікаў, і са склочніцтвам, службовай расхлябанасьцю і г. д.

Камісія знойдзе ў гэтых сэкцыях цэлую галерэю антысавецкіх асоб, «былых» людзей, выпадкова траплёўшых у савецкі апарат, людзей, якія перашкаджаюць пасьпяховай рабоце сэкцый, займаюцца плёткамі, склокамі і г. д. і менш усяго думаюць аб выкананьні сваіх службовых абавязкаў. Факты? На жаль, мы можам падаць шмат фактаў.

***

У санітарнай сэкцыі працуе т. **Дункан**. Яна — камуністка, актыўны, сумлены працаўнік. Тав. **Дункан** заўсёды імкнулася наладзіць работу сэкцыі, але.... старшы статыстык **Стакавецкая** гэтаму перашкаджае. Стакавецкая ўпайшла сабе добрага памочніка—супрацоўніцу **Ваксэнбург**. З боку гэтых супрацоўніц заўважаецца сыстэматычнае цкаваньне т. **Дункан**. Стакавецкая і Ваксэнбург займаюцца распаўсюджаньнем брыдкіх плётак, склокамі, антысавецкімі выхадкамі... Стакавецкая і Ваксэнбург сваімі паводзінамі зрываюць работу сэкцыі. Зразумела, якая можа быць работа, калі старшы статыстык і супрацоўніца сьвядома гармозяць гэту работу.

Ня дзіва, што ў санітарнай сэкцыі ёсьць скаргі на бязгуздыя загады старшых статыстыкаў.

Яшчэ адна невялічкая заўвага: супрацоўніца Ваксэбург ня ўмее захоўваць сваіх антысавецкіх настрояў. Ваксэнбург не саромяецца пры ўсіх супрацоўніках успамінаць пра сваё мінулае жыцьцё ў Варшаве, пра тое, як там добра жыць і як дрэнна жыць у «гэтай Беларусі».

Гэта дробная рыса яскрава характарызуе сапраўдныя сымпатыі супрацоўніцы Ваксэнбург.

***

Некалькі слоў аб супрацоўніку **Паслаўскім**. Пра яго можна сказаць толькі адно—**бюракрат**. Паслаўскі груба і няўвазліва абыходзіцца з наведвальнікамі. Наведвальнікі ўжо добра азнаёміліся з бюракратызмам Паслаўскага. Яны нават прыходзяць за рознымі даведкамі толькі тады, калі Паслаўскага няма ў сэкцыі. Бо ўсё роўна, калі Паслаўскі знаходзіцца ў сэкцыі, дык нічога ад яго не даведаешся. Ня лепш адносіцца Паслаўскі і да супрацоўнікаў.

Паміж іншым Паслаўскі быў цесна зьвязаны з цёплай кампаніяй былых супрацоўнікаў ЦСУ—з **Кабаевым, Смародзінскай** і г. д., якія былі вычышчаны в ЦСУ, як бюракраты і антысавецкія асобы.

***

Нарэшце, супрацоўнік **Ржаў**. Праўда, напісаць аб ім няма чаго. Чалавек цэлы дзень сядзіць ва ўстаноўе і нічога ня робіць.... што-ж будзеш аб ім пісаць? А тое, што Ржаў дарэмна атрымлівае пэнсію... гэта....

Ну добра, аб гэтым апошнае слова скажа камісія на чыстцы апарату.

***

Нашу галерэю можна было-б яшчэ працягнуць, але пакуль што хопіць. Мы ўпэўнены, што камісія на чыстцы ЦСУ зробіць адсюль належныя вывады.

Г. Т—к.

Пазычце трохі зацікаўленасьці

Гэтымі днямі пачынаецца чыстка апарату ЦСУ. Трэба прыгледзецца да кожнай сэкцыі паасобна, ці няма там адмоўных бакоў у працы, ці няма там цыганіны, бюракратызму і г. д. Возьмем, напрыклад, **камунальную сэкцыю.**

Работа на вучоце фактычнага будаўніцтва пастаўлена дрэнна, асабліва ў Менскім і Бабруйскім акрстатбюро. Матар'ял па вучоце будаўніцтва прысылаецца з вялікай зацяжкай і дрэннай якасьці. Бабруйскае акрстатбюро прысылала матар'ял па вучоце будаўніцтва няпоўны.

Чаму дрэнная якасьці матар'ял?

Гэта тлумачыцца тым, што кепска пастаўлена арганізацыйная праца. Ня было правільнай праверкі запоўненых рэгістратарамі картак. З боку сэкцыі ня было дана належнай ўстаноўкі аб тэхніцы вядзеньня абсьледваньня і праверцы паступаючага матар'ялу ад рэгістратараў. Гэта можна было-б зрабіць вельмі лёгка, але з боку працаўнікоў сэкцыі няма ніякай зацікаўленасьці.

Нядбайныя адносіны да працы выклікалі досыць вялікую перапіску з боку камунальнай сэкцыі. Напрыклад, матар'ял, які прысылаўся акрстатбюро, пасылаўся назад для пераапрацоўкі. Гэта выклікала непатрэбную цыганіну, трату сродкаў, затрымку ў распрацоўцы матар'ялу, а гэтым самым зьніжаецца і вартасьць матар'ялу.

Супрацоўнікі не знаёмы з плянамі работ, а таксама і з вынікамі распрацовак матар'ялаў. Супрацоўнікі часта ня ведаюць мэты і зьместу працы. Гэта стварае ў супрацоўнікаў мэханічныя адносіны да справы і незацікаўленасьць да работы.

Працдысцыпліна ў сэктары кульгае, беларусізацыя таксама. Абежнікі пішуцца часткова на расійскай мове.

Трэба лепш прыгледзецца камісіі па чыстцы апарату да камунальнай сэкцыі, праверыць яе працу, бо праца ў камунальнай сэкцыі пастаўлена дрэнна.

Б—к.

Лічбы... са столі

Дэмаграфічная сэкцыя ЦСУ займаецца статыстыкай руху насельніцтва. Але гэта рэгістрацыя пакідае жадаць шмат лепшага. Яна хварэе непаўнатой. Месцы дрэнна запаўняюць карткі аб нараджэньні і сьмерці. Няма поўнай і дасканалай рэгістрацыі самагубстваў. Нядбайна адносяцца статыстычныя органы да распрацоўкі табліц аб нармальным руху насельніцтва.

У Маскву паслалі канчатковую табліцу, у якой адзначана на 600 чял. менш, чым у папярэдняй.

Наглядаецца рэгістрацыя памёршых і народжаных па 2 разы, на што статорганы зьвяртаюць мала ўвагі. Гэта вядзе да злоўжываньняў наведвальнікаў з мэтай атрыманьня лішняй дапамогі, а таксама да поўнай блытаніны ў статыстычных матар'ялах.

Акруговыя статбюро нядбайна адносяцца да прысылкі дадатковых вестак за ранейшы час. Напрыклад, Магілёўскае акрстатбюро не дасылала картак прыблізна 800-900 штук, што адбіваецца на распрацоўцы вестак аб нармальным руху насельніцтва. Весткі з акруг часта спазьняюцца на 4-5 месяцаў, ня гледзячы на прапановы ЦСУ.

Не вядзецца распрацоўка нармальнай сьмяротнасьці ў вясковых мясцовасьцях, што не дае магчымасьці выявіць санітарнае становішча вёскі.

Нарэшце, трэба зьвярнуць увагу на адносіны загадчыка сэкцыі да стажораў. Іх не інструктуюць, не адказваюць на іх пытаньні. Гэтыя адносіны трэба вымяніць у корані.

Хваробы статыстыкі хвароб

Няхай выпечыць камісія па чыстцы

Аддзел санітарнай статыстыкі ЦСУ павінен распрацоўваць даныя аб агульным захворваньні насельніцтва БССР. Акрамя таго, ён займаецца ведамственай статыстыкай—падлікам эпідэмічных хвароб і дзейнасьці мэдыка-санітарных устаноў БССР.

Санітарная статыстыка патрабуе плянавага, сыстэматычнага, бесьперабойнага падліку лічбовага матар'ялу, бо інакш рызыкуе адстаць на некалькі год.

На жаль, тут як раз самае слабое месца аддзелу санітарнай статыстыкі ЦСУ.

Перш на перш распрацоўка матар'ялаў робіцца паасобнымі часткамі за 1926, 27, 28 год, няма закончанай распрацоўкі ні за адзін год. Адсутнасьць распрацаванага матар'ялу за такі доўгі працяг часу, зразумела, падрывае ў мэдпэрсаналю ўсякую ахвоту займацца картачнай рэгістрацыяй, бо яны глядзяць на гэта як на лішнюю цягаціну.

Шмат часу ў аддзеле ідзе на пераапрацоўку матар'ялаў, якія прысылаюцца акругамі. Так, напрыклад, Гомельская акруга, ня гледзячы на адпаведнае распараджэньне, прысылала матар'ял, раскладзены ня як належыць, прышлося на пераапрацоўку страціць лішнія 16 чал.-дзён.

Менская, Гомельская і Мазырская акругі прысылалі нядобраякасны матар'ял па эпідэмічных хваробах, на выпраўленьне якога пашло 16½ чал.-дзён работы старэйшага статыстыка.

Менскае акрстатбюро, ня гледзячы на прапанову ЦСУ, затрымала ў сябе 18 тысяч картак па эпідэмічных хваробах, што выклікала перабой у рабоце і пераапрацоўку матар'ялу. Тое-ж здарылася і ў Гомельскай акрузе.

Культае і ведамственная статыстыка. Многія акругі спазьняюцца з прысылкай штомесячных вестак аб заразных хваробах і даных аб сетцы лекавых устаноў.

Акруговыя статбюро (Бабруйск, Віцебск і Мазыр) нядбайна правяраюць матар'ялы, што выклікае лішнюю перапіску.

Не наладжаны падлік работы супрацоўнікаў, бо матар'ял прысылаюць непадлічаным у пачках, прычым аддзел за 3 гады ня даў адпаведнага распараджэньня на акругах.

На ўсе гэтыя недахопы трэба будзе зьвярнуць увагу пры праверцы апарату ЦСУ.

Е.

Павольным крокам па шляху рацыяналізацыі

або

аб самакрытыцы на паперы і ворагах высокай прадукцыйнасьці

ЦСУ—РАХУНКОВАЯ ФАБРЫКА

З пункту погляду арганізацыі статыстычнае працы і тэхнікі выкананьня статыстычных работ, статыстычныя органы падобны да вытворчых прадпрыемстваў. Уся работа ЦСУ, напрыклад, прадстаўляе сабой на 75-80 проц. рахункова-тэхнічны працэс, якасьць выкананьня якога залежыць выключна ад інтэнсыўнасьці працы, тэхнікі выкананьня і г. д., карацей кажучы, залежыць ад тых-жа ўмоў, ад якіх залежыць прадукцыйнасьць працы ў кожным фабрычна-заводзкім прадпрыемстве. Каб пацьвердзіць правільнасьць сказанага, трэба паказаць на тое, што значная частка статыстычных работ можа быць нават мэханізавана. Апарат ЦСУ можа быць, такім чынам, разглядзаны ў большай сваёй частцы, як **вялікая рахункова фабрыка.** Выключэньне складае толькі невялікая частка апарату, якая занята аналізам вынікаў рахунковых работ, зробленых большасьцю апарату.

З усяго сказанага відаць, якую вялізную ролю ў рабоце ЦСУ адыгрываюць пытаньні **прадукцыйнасьці працы, працдысцыпліны, рацыяналізацыі статыстычнае вытворчасьці і г. д.**

ДОБРАСУМЛЕННАЯ САМАКРЫТЫКА... НА ПАПЕРЫ

Як-жа, аднак, адносяцца да гэтае справы ў ЦСУ? На гэта пытаньне прыходзіцца адказаць, на жаль, адмоўна, пры чым да адмоўнага вываду прыходзяць ня толькі пабочныя абсьледвальніні работы ЦСУ, але і самі кіруючыя працаўнікі. Так, напрыклад, на пасяджэньні калегіі ЦСУ 17-га красавіка г.г. пад старшынствам т. Пайкіна была вынесена паступная пастанова: «Канстатаваць, што, ня гледзячы на паўнасьць адзнак некатораго павышэньня працдысцыпліны, **усё-ж у адносінах рацыяналізацыі работ амаль нічога ня зроблена».**

Гэта прызнаньне адміністрацыі ў тым, як праводзіцца рацыяналізацыя статыстычнай вытворчасьці, гаворыць само за сябе і не адчувае патрэбы ні ў якіх камэнтарах. Аднак, пасьля гэтай, здавалася-б, вельмі добрасумленнай самакрытыкі, працаўнікі ЦСУ павінны былі прыняць больш рашучыя меры да палепшэньня становішча. Між тым выкрываецца рад фактаў, якія сьведчаць аб тым, што, ня гледзячы на мінулы прамежак часу, выкладаная пастанова да сучаснага моманту засталася толькі самакрытыкай на паперы, амаль ніякага ўплыву на сапраўднасьць не зрабіла.

ХТО ВІНАВАТЫ: МЯСЦКОМ ЦІ АДМІНІСТРАЦЫЯ?

На пасяджэньні калегіі ЦСУ была вынесена наступная пастанова: «Прасіць грамадзкія арганізацыі склікаць агульны сход працаўнікоў для справаздачнага дакладу ЦСУ аб выніках выкананьня пляну работ у першым паўгодзьдзі і для пастаноўкі пытаньня аб узьняцьці прадукцыйнасьці працы ў далейшым». Гэта пастанова зьяўляецца, зразумела, разумнай, але, на жаль, да гэтага часу не праведзена ў жыцьцё. Адміністрацыя запэўняе, што яна прасіла грамадзкія арганізацыі прыняць меры да выкананьня гэтае пастановы. Але, як-бы там ні было, незалежна ад таго, хто вінаваты—грамадзкія арганізацыі ці адміністрацыя—факт застаецца фактам: такое хвалюючае пытаньне, па якім ёсьць даволі шматгазорачае прызнаньне саміх кіраўнікоў ЦСУ, засталося без грамадзкага абгаварэньня да гэтага часу.

КАЛЬЦАВАЯ ПОШТА Ў... ЗАЧАРАВАНЫМ КОЛЕ

На пасяджэньні калегіі ЦСУ 10-га мая г.г. зноў абгаворвалася пытаньне рацыяналізацыі работы ЦСУ. Не закранаючы тут асобных мерапрыемстваў, намечаных на гэтым пасяджэньні, адзначым толькі, **што большасьць з іх да сучаснага моманту не праведзена ў жыцьцё.** Для характэрыстыкі тэмпу работы ў гэтым напрамку, возьмем наступны факт: Адзін з шматлікіх пунктаў гэтае пастановы гаворыць: «Сакратарыяту ўстанавіць кальцовую пошту ўнутры ЦСУ»

Азнаямленьне з работай ЦСУ гаворыць аб сапраўды брыдкім прахаджэньні карэспандэнцыі па вельмі разгалінаваным апараце ЦСУ (два паверхі, шмат сэкцый, звыш 250 супрацоўнікаў). Так, напрыклад, нядаўна было выкрыта, што матар'ял, высланы з Масквы для сэктару абмену, на працягу месяца супакойна знаходзіўся ў канцылярскіх нотрах ЦСУ і быў выкрыты толькі пасьля доўгай тэлеграф-перапіскі па гэтым пытаньні з Масквой.

РАСЬСЛЕДВАНЬНЕ ГЭТАГА ФАКТУ ПАПАЛА Ў БАГНА ЦЯГАНІНЫ

З поваду вылажанага вышэй выпадку з карэспандэнцыяй сэктару абмену было даручана зрабіць расьсьледваньне для выяўленьня вінаватых і накладаньня адпаведнага спагнаньня, але «воз и ныне там»: расьсьледваньне гэтае справы трапіла ў багну цяганіны і яўнае злачынства застаецца нявыкрытым.

ХТО СУПРОЦЬ ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЙ СЫСТЭМЫ

Скончанае падаўна абсьледваньне магчымасьць намеціць рад мерапрыемстваў па рацыяналізацыі апарату ЦСУ, у ліку якіх ёсьць мерапрыемствы аб пераводзе асобных частак апарату на функцыянальную (групавую) сыстэму.

З дня прыняцьця гэтае пастановы калегіяй РСІ (прычым гэта было ўзгоднена з ЦСУ) прайшло ўжо шмат часу. Між тым, гэтыя мерапрыемствы ня толькі не праведзены ў жыцьцё, але заўважваюцца да іх адносіны, што сваім характарам нагадваюць проста процідзейнічаньне іх правядзеньню ў жыцьцё. Пытаньне аб увядзеньні групавой сыстэмы ўжо ня раз абмяркоўвалася ў апараце ЦСУ, але чамусьці да гэтага часу ў гэтым напрамку нічога ня зроблена. З поваду-ж другой меры (стварэньня аб'яднаньня статыстыкі аховы здароўя) ЦСУ раптам нават паслала паперу ў РСІ адносна скасаваньня гэтае пастановы, ня гледзячы на тое, што гэта пастанова РСІ была ўзгоднена з кіруючымі працаўнікамі ЦСУ.

Між тым, ад мерапрыемстваў па рацыяналізацыі работ ЦСУ залежаць пытаньні агульнай плянавасьці работ ЦСУ, захоўваньне тэрмінаў, устаноўленых для асобных работ і ў некаторай меры—нават і якасьць асобных работ.

АДСУТНІЧАЕ АСНОЎНАЕ—НОРМЫ ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦІ

З усяго сказанага вынікае, у якім становішчы знаходзіцца прадукцыйнасьць працы ў ЦСУ. Для ілюстрацыі даволі толькі адзначыць, што, напрыклад, да гэтага часу адсутнічаюць якія-небудзь нормы прадукцыйнасьці, ня гледзяч

1.700 магілеўскіх рабочых--на Асінбудзе

Асінбуд прыняў выклік магілеўскіх будаўнікоў на сацыялістычнае спаборніцтва

15 чэрвеня Рабачком Асінбуду атрымаў тэлеграму, у якой рабочыя-будаўнікі г. Магілева выклікаюць рабочых і служачых Асінбуду на сацыялістычнае спаборніцтва.

16 чэрвеня на Асінбуд прыбыў спэцыяльны цягнік з Магілева. Прыехалі 1.709 чалавек магілеўскіх рабочых для агляду будаўніцтва, у тым ліку, і рабочыя-будаўнікі г. Магілева, на чале з дэлегацыяй для вядзеньня перамоў па заключэньні ўмоў на спаборніцтва.

Мітынг на будаўніцтве

Пасьля ўрачыстага спатканьня, якое зрабілі рабочыя і служачыя Асінбуду і сяляне, быў арганізаваны мітынг, у якім прынялі ўдзел будаўнікі станцыі і госьці, гаварылі аб неабходнасьці ўсім і кожнаму прыняць самы чынны ўдзел у справе сацыялістычнага спаборніцтва і давесьці, што энтузіязм мас дасьць магчымасьць выканаць 5-цігадовы плян разьвіцьця народнай гаспадаркі.

Пасьля мітынгу галоўны інжынэр Асінбуду тав. Алейнікаў зрабіў падрабязны даклад аб ходзе будаўніцтва.

Пасьля дакладу госьці разьдзяліліся на групы, па 400 чалавек, з якіх адна накіравалася ў клюб-сталовую на абед, другая — на агляд кватэрнага будаўніцтва ў Арэхах і трэцяя—на агляд работ па пабудове галоўнага будынку Асінбуду. Кожным 25-30 чалавекам дарэдняя згода па наступных пунктах:

выканаць цалкам плян будаўнічых работ на 1928-29 г.;

зьнізіць сабекошт будаўніцтва на 5 проц. за лік рацыяналізацыі вытворчых працэсаў;

найхутчэй зьнішчыць прагулы;

падняць прадукцыйнасьць працы і працоўную дысцыпліну;

вылучыць ударныя ўзорныя брыгады для сацыялістычнага спаборніцтва.

19 чэрвеня г. г. умова будзе абгаворвацца на агульным сходзе рабочых і служачых Асінбуду, 22 чэрвеня дэлегацыя ад Асінбуду выяжджае ў Магілеў для падпісаньня дагавора.

Пасьля агульнага сходу госьці хадзілі ў пасёлак Вырдыцу, дзе аглядалі пасёлак, часовую электрастанцыю ды іншае.

У 8 гадзіне ўвечара госьці адехалі ў Магілеў.

Р.

Капітальнае будаўніцтва па лініі каапэрацыі пад пагрозай зрыву

Няма праектаў і каштарысаў

Грошы выдаюцца не па прызначэньні

Сёлета праграма капітальнага будаўніцтва па лініі спажывецкай каапэрацыі вызначаецца ў суме 2 мільёны рублёў. Будуюцца хлебазаводы, сталоўкі, базы, склады і крамы.

Сход упаўнаважаных Белкаапсаюзу абгаворваў пытаньні капітальнага будаўніцтва ў каапэрацыі і пастанавіў арганізаваць пры Белкаапсаюзе будаўнічае бюро, якое павінна было-б кіраваць гэтай працай. Гэткае бюро быццам ужо ёсьць у Белкаапсаюзе, але парадку ў каапэрацыйным будаўніцтве няма.

Весткі, якія паступаюць з месц, прымушаюць біць трэвогу. Пляны капітальнага будаўніцтва пад пагрозай зрыву.

Гомельскі і Рэчыцкі ЦРК яшчэ дагэтуль не прадставілі праектаў і каштарысаў на пабудову сталовак. У Бабруйскага ЦРК няма праекту на пабудову хлебазаводу.

З прычыны нядбайнасьці пры складаньні праектаў і каштарысаў многія пабудовы каштуюць даражэй амаль на 100 проц. Так на пабудову Віцебскага хлебазаводу было адпушчана па каштарысе 220.000 р. а цяпер выяўляецца, што завод будзе каштаваць каля 350 тысяч рублёў. Тое-ж самае з хлебазаводам у Воршы.

Усе ЦРК атрымалі грошы на пабудову мясных крам, але большасьць з іх пусьціла значную суму у гандлёвы зварот, а не на будаўніцтва крам.

Барысаўскі ЦРК атрымаў 33.000 руб. на мэханізацыю хлебапячэньня, але ён закупіў абсталяваньня на 10.000 руб., якое ляжыць на дварэ і іржавее, а пабудова хлебапякарні ня скончана.

Пастанова НК РСІ і эканомнарады прадугледжвала прадстаўленьне да 15 чэрвеня праекту на пабудову ў Менску фабрыкі-кухні. Але дагэтуль аб гэтым праекце і ня думаюць.

Як выдаюцца ўжо адпушчаныя сродкі на будаўніцтва? Ці выконваецца дырэктыва аб зьніжэньні кошту будаўніцтва на 15 проц.? Ніхто, нават Белкаапсаюз, аб гэтым ня ведае. Вядома толькі, што ні адна пабудова ня будзе скончана ў вызначаны тэрмін. Ні адзін ЦРК яшчэ не заказаў абсталяваньня для заводаў, сталовак.

У Белкаапсаюзе займаюцца «кіраўніцтвам» будаўніцтва ўсе, каму толькі хочацца, але сапраўднай адказнасьці за гэту працу няма, ня гледзячы на тое, што ёсьць тэхнік, ёсьць тэхнічна-будаўнічае бюро на чале з членам праўленьня.

Шмат пісалася аб гэтых непарадках у насьценгазэце Белкаапсаюзу, гаварылася на сходах, але пакуль што нічога не дапамагае.

К.

Малочны саюз ня выконвае пастановы Эканомнарады

Рэзэрвы масла ня створаны

Пастанова Эканомнарады БССР аб стварэньні рэзэрву масла на асеньня-зімовы перыяд знаходзіцца пад пагрозай невыкананьня. Усяго для рэзэрву беларускім малочным саюзам здана каля 12 тон зам ест намечаных за май 50 тон. Але і гэтыя 12 тон, дзякуючы дрэнпай тары, апрацоўцы і захаваньню масла-- для хаваньня не падыходзяць.

Малочны саюз на прыняў належных мер, каб тое масла, якое прызначана для рэзэрву, можна было-б доўга хаваць. Некаторыя малочныя арцелі пасылаюць масла ня ў бочках, а ў скрынках. Гэтае масла, незалежна ад якасьці, нельга хаваць доўгі час.

Пры гэткіх адносінах да стварэньня рэзэрваў, пайшчыні рабочай каапэрацыі Беларусі могуць на асеньня-зімовы перыяд застацца без масла.

Прэзыдыум Белрабоэкцыі ўсе матар'ялы перадаў у НК РСІ, Наркамгандлю і Эканомнараду.

Адначасова Белрабоэкцыя ставіць пытаньне аб поўнай адказнасьці малочнага саюзу як за выкананьне заданьня, так і за добрую якасьць загатоўленага масла.

МЕНСК

На пленуме ЦБ пралетстуду

Падрыхтоўка новых кадраў навуковых працаўнікоў

У сваім дакладзе старшыня Галоўнавукі БССР т. НЕКРАШЭВІЧ адзначыў рост ліку асьпірантаў. У 1927 г. іх было 10, а ў гэтым годзе 130. У новым навучальным годзе лік асьпірантаў будзе даведзен да 200. Пры навучальных установах ствараецца інстытут СТУДЭНТАЎ-ВЫЛУЧЭНЦАЎ У АСЬПІРАНТЫ. Такія студэнты будуць атрымліваць павышаныя стыпэндыі. Вызначаюцца сродкі для камандыровак асьпірантаў па СССР.

Выступаўшыя ў спрэчках зазначалі на ДРЭННЫ САЦЫЯЛЬНЫ СКЛАД асьпірантаў, асабліва ў навукова-дасьледчых установах. Так, сярод асьпірантаў ёсьць 8 проц. «іншых», а па навукова-дасьледчых установах гэты процант даходзіць да 15. Сярод асьпірантаў толькі 14 проц. рабочых, 22 проц. служачых і 56 проц. сялян. Паказвалася таксама на дрэннае кіраўніцтва працай асьпірантаў.

Далей пленум заслухаў даклад аб папярэдніх выніках культурна-бытавога агляду студэнцтва Беларусі.

Пленум вывеў са складу ЦБ былую студэнтку Віцебскага белпэдтэхнікуму за захаваньне свайго сацыяльнага складу (дачка былога жандара). Апрача таго, вызвален ад працы ў прэзыдыуме рад таварышоў у зьвязку са сканчэньнем навучаньня і пераходам іх на іншую працу. Замест іх у прэзыдыум ЦБ абраны т. Залатэрскі, Раскін, Хадаровіч і інш.

Акруговая канфэрэнцыя саюзу тэкстыльшчыкаў

У Менску, паводле прапановы ЦП саюзу тэкстыльшчыкаў, арганізуецца акруговае аддзяленьне саюзу тэкстыльшчыкаў.

6-га ліпеня адбудзецца першая акруговая канфэрэнцыя тэкстыльшчыкаў. Зацьверджаны такі парадак дня канфэрэнцыі: Справаздача гарадзкога праўленьня і рэўкамісіі, даклад кіраўніцтва працкалектываў тэкстыльшчыкаў і выбары.

Абсьледваньне Беларускага Дзяржаўнага музэю

У бліжэйшыя дні пачнецца абсьледваньне беларускага дзяржаўнага музэю. Будзе абсьледвана гаспадарча-фінансавае становішча музэю, а таксама і ўся работа па абслугоўваньні наведвальнікаў і інш. Для правядзеньня абсьледваньня вылучана камісія, у якую вылучаны т.т. Платун (ЦП саюзу працасьветы), Лысаў (НК Асьветы) і Радкевіч (Мен. АК КП(б)Б).

У камісію ўвайшлі таксама прадстаўнікі Фрунзаўскага РК КП(б)Б і РСІ.

Адбор студэнтаў на хэміка-хэмічны факультэт БДУ

Зацьверджан склад камісіі на адборы студэнтаў на хэміка-тэхнічны факультэт Белдзяржуніверсытэту. У камісію ўвайшлі т.т. Цэнцыпэр, Вішнеўская, Каран (Мен. АК КП(б)Б), Табайнік (ЦСПСБ) і Шыманскі (НК Асьветы).

Гэтая камісія будзе праводзіць прыём таксама і ў магілеўскі палітасьветтэхнікум.

Завочная студэнцкая кансультацыя

Пры ЦБ пралетстуду разгарнула работу завочная кансультацыя, якая дае даведкі ўсім жадаючым паступіць у навучальныя ўстановы БССР. Даведкі даюцца пры пасылцы запытаньняў з аплачаным адказам.

200 скрынак цытрынаў

Белрабоэкцыя атрымала з Адэсы 200 скрынак цытрынаў, якія разьмяркоўваюцца па ЦРК. Менскаму ЦРК адпушчана 50 скрынак, кошт цытрыны 20-25 к.

«СПОРТ»

Гэтымі днямі распачаўся прафсаюзны розыгрыш па баскетболе, валейболе і г. д. Гульні адбываюцца на пляцоўцы «Прафінтэрн». У прафсаюзным розыгрышы прымаюць удзел амаль усе каманды прафсаюзаў.

15 чэрвеня на пляцоўцы «Прафінтэрн» адбыліся гульні па футболе, валейболе і футболе як жаночых, так і мужчынскіх каманд.

Баскетбол. Каманда мэталістых гуляла з харчавікамі. Выйгралі мэталістыя з вынікам 14 : 11 Нарсвязь выйграла ў гарбароў з вынікам 25 : 9.

Валейбол. Жаночая каманда нарсувязі выйграла ў гарбароў з вынікам 2 : 1. Мужчынская каманда Барысава гуляла з камандай друкароў. Гульня скончылася ў карысьць Барысаўскай каманды з вынікам 2 : 1. Каманда друкароў гуляла з камандай БДУ. Выйгралі друкары з вынікам 2 : 1.

Футбол. «Дынама» гуляла з мэталістымі. Выйграла «Дынама» (1:0)

16 чэрвеня таксама адбыліся гульні па баскетболе і валейболе. На пляцоўцы прысутнічала шмат людзей.

Баскетбол. Каманда Усебеларускіх курсаў інструктароў фізкультуры гуляла з камандай «Дынама». Прайграла «Дынама» (36 : 11). Добрую гульню паказаў курсант Станкевіч. Выйграла каманда БДУ у камунальнікаў з вынікам 23 : 12.

У прэзыдыуме ЦВК

Сталыя камісіі садзейнічаньня дзяржаўнаму крэдыту і ашчаднай справе

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў арганізаваць пры акруговых і раённых выканаўчых камітэтах і пры гарадзкіх, местачковых і сельскіх саветах сталыя камісіі садзейнічаньня дзяржаўнаму крэдыту і ашчаднай справе. На камісіі садзейнічаньня пры саветах і выканкомах усклада-ецца: арганізацыя камісій садзейнічаньня пры ўстановах, прадпрыемствах і арганізацыях, кіраўніцтва і нагляд за іх дзейнасьцю, а таксама арганізацыя масавай растлумачальнай работы пра дзяржаўныя крэдыты і ашчадную справу.

Арганізаваны бюро скаргаў пры ЦРК

Пры Менскім, Бабруйскім, Гомельскім і Віцебскім ЦРК арганізаваны бюро скаргаў. Прэзыдыум Белрабоэкцыі зацьвердзіў палажэньне аб гэтых бюро. У абавязкі іх уваходзіць: разгляд усіх вусных і пісьмовых скаргаў пайшчыкаў на працаўнікоў каапэратыву, а таксама скаргаў і на саміх пайшчыкаў. Разбор скаргі праводзіцца не пазьней, чым у тыднёвы тэрмін.

Здарэньні

ТРАПІЎ ПАД АЎТАБУС. У Менск у больніцу дастаўлены вучань Бягомльскай сямігодкі Пархімовіч. Апошні трапіў пад аўтабус, які адпраўляўся з Бягомля на Полацак, і цяжка паранены.

80-ці ГАДОВЫ САМАЗАБОЙЦА. У вёсцы Маргавіцы, Менскае акругі, павесіўся С. Кандратаў 80 год. Прычына самазабойства—сямейныя сваркі.

Пажар

Учора а 12 гадз. дня, ва дварэ дому „Культуры" загарэўся склад дроў. Агонь пагражаў суседнім будынкам прафтэхшколы і музэю рэвалюцыі.

На месца пажару прыбылі ўсе гарадзкія пажарныя часьці. Дзякуючы энэргіі пажарных часьцей, пажар удалося праз 1-1 з пал. гадзіны ліквідаваць. У вывязку з рамонтам вадаправоду, хуткай ліквідацыі пажару перашкаджала адсутнасьць вады. Прычыны пажару і страты высьвятляюцца.

Пачынаецца чыстка апарату Белдзяржстраху

1 ліпеня пачынаецца чыстка апарату Белдзяржстраху. Камісія па чыстцы зацьверджана ў наступным складзе: старшыня — прадстаўнік РСІ т. Медзінок (ВСНГ), члены—рабочыя ад варштату тав. Валахнянскі (завод Энэргія), т. Івашчанка (дэпо чыгункі), т. Чарняўскі (мясцком Белдзяржстраху) і т. Чарнушэвіч (адміністр. Белдзяржстраху).

Камісія просіць усе дзяржаўныя і грамадзкія ўстановы і арганізацыі, а таксама рабочых і сялян прыняць актыўны ўдзел у чыстцы апарату Белдзяржстраху, паведамляючы ў камісію аб усіх фактах пяганіны, бюракратызму, шкодніцтва і дыскрэдытаваньня ўлады. Вусныя скаргі і заявы прымаюцца ад 9 да 12 гадзін старшынёй камісіі тав. Медзінекам у памешканьні ВСНГ (пляц Волі, пакой 27), кожны дзень дзяжурным членам камісіі ад 6 да 9 гадзін увечары, у памяшканьні Белдзяржстраху (Савецкая, 68, 3-і паверх у габінеце члена праўленьня). Пісьмовыя заявы і скаргі пасылаць: НК РСІ, — цэнтральнай камісіі па чыстцы, або на імя старшыні камісіі т. Медзінека. Таксама пісьмовыя заявы можна кідаць у скрынку ля ўваходу ў памяшканьне Белдзяржстраху.

Ліст у рэдакцыю

Тав. рэдактар! Прашу зьмясьціць ліст аб наступным

— З канца 1927 году, далучыўшыся да трацкісцкай апазыцыі, усьлед за яе ідэёвым і арганізацыйным разгромам—перайшоў на нелегальную падпольную работу, якая дапамагае антысавецкай справе стварэньня другой партыі.

У канцы 1928 году, стварыўшы ў Нова-Барысаве «трацкісцкі цэнтр», пачаў папіраць антыленінскую літаратуру, весьці індывідуальную «апрацоўку» больш адсталых рабочых, выступаць на агульных сходах, дабіваючыся дыскрэдытацыі партыйнай, прафэсыянальнай работы, а таксама падрыву аўтарытэту больш перадавых камуністых. Распальваньне нездавальненьня рабочых, а дзе яго ня было, узбуджаючы яго скажонымі довадамі няправільнасьці лініі партыі, якая нібы вядзе ўсё больш і больш націск па рабочую клясу. Сёй-той у гэтай каламутнай вадзе на гэтыя вудачкі быў злоўлены

У пэрыяд самай вострай падпольнай работы, калі трацкістыя сталі на яўна контр-рэвалюцыйны шлях, заклікаючы зрываць калдагавары, наладжваць забастоўкі, кожны сумленны рабочы-апазыцыянэр, які не жадае шкоды савецкай уладзе, дыктатуры пралетарыяту, не жадае быць перашкодай вялікаму размаху работы, што праводзіцца партыяй па перабудаваньні нашай краіны на сацыялістычны лад, павінен быў паставіць пытаньне: за што ён змагаецца? З кім ён ідзе далей? Ці ў радох УсеКП(б), якая вядзе непамерна-вялікую работу ў справе сацыялістычнага будаўніцтва, бязьлітасна рашучую барацьбу з капіталістычнымі элемэнтамі гораду і вёскі і іх ідэалёгамі—правым апартуністычным ухілам,—якія яўна выяўляюць інтарэсы ўзрастаючага, паднімаючага галаву кулака і нэпмана, антыленінскай тэорыяй «урастаньня кулака ў сацыялізм». Ці ў радох УсеКП(б), якая карэнным чынам ламае стары, руцінны быт, праводзіць найцяжэйшую задачу культурнай рэвалюцыі, бязьлітасна змагаецца з усімі відамі бюракратызму і ў гэтых мэтах чысьціць чужых рабочай клясе людзей, што прымазаліся да савецкага апарату.

Або ў радох простых контр-рэвалюцыянэраў, да якіх, паміма свайго жаданьня, скацілася трацкісцкая апазыцыя.

Паставіў гэтае пытаньне і я.

Не жадаючы быць ні простым і ні ўскосным ворагам савецкай улады і дыктатуры пралетарыяту (а апошнім я быў паміма свайго жаданьня, паказалі і адкрылі мне на гэта мае вочы бачныя мною прыяцельскія адносіны меншавікоў да трацкістых). Прыходжу да цьвёрдага перакананьня, што я памыліўся, уступіўшы на шлях фракцыйнай барацьбы, які завёў мяне ў непраходны тупік. Адсюль раблю вывад, што далей мне з трацкістымі не па дарозе.

Гэтаму дапамагло грунтоўнае вывучэньне пастаноў XV партзьезду і канфэрэнцыі, якія паказалі мне, што за надворнай бліскучасьцю, за надворнай рэвалюцыйнасьцю хаваецца нікчэмная, няўжытная для рабочае клясы сутнасьць трацкісцкай ідэалёгіі, што пастановы XV партзьезду, XV і XVI партканфэрэнцый зьяўляюцца сапраўды ленінскімі, якія я зараз бяру на сябе абавязак праводзіць у жыцьцё. І яшчэ ў большай меры безадказны, абураючы па сваёй іджывасьці выпад супроць СССР і УсеКП(б) у фашысцкім друку лідэра апазыцыі Троцкага. Гэта агідна сьць абурае кожнага сумленнага рабочага і апазыцыянэра.

Зараз рашучым чынам як арганізацыйна, так і ідэёва парываю, адмяжоўваюся ад трацкістых з тае прычыны, што яны льлюць ваду на контр-рэвалюцыйны млын, гэтым самым наносячы непапраўную шкоду савецкай уладзе і дыктатуры пралетарыяту, ускосна натхняючы нашых зарубежных ворагаў для нападу на СССР. Выходзячы з гэтага бяру на сябе абавязак змагацца супроць існуючых ухілаў ад генэральнай лініі партыі, выкрываючы як трацкістых, так і правых апартуністых у практычнай рабоце.

Заклікаю сумленных таварышоў рабочых, якія да гэтага часу блыталіся, пляліся ў хвасьце трацкісцкага абозу, пасьледаваць майму прыкладу.

Рабочы фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна», б. член КП(б)Б з 1925 г., былы член «трацкісцкага цэнтру»

Сяргей Сінайскі.

Поўнасьцю далучаюся да заключэньня т. Сінайскага. Рабочы заводу імя Леніна, б. член «трацкісцкага цэнтру»—

Пятро Ігнатовіч.

Далучаюся да заключэньня т. Сінайскага і яшчэ раз самым рэзкім чынам асуджаю контр-рэвалюцыйную работу трацкістых і выступленьне самога Троцкага. Былы камсамолец з 1925 г., рабочы фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна»

Уладзімер Незаконаў.

Баявы атрад настаўнікаў--на культурны фронт

На выпуску пэдфаку

15-га чэрвеня пэдфак БДУ ў пяты раз сьвяткаваў выпуск чырвоных настаўнікаў.

— 268 барацьбітоў, узброеных навукай, са сьвежымі сіламі рынуцца на перадавыя лініі культурнага фронту—кажа дакладчык, дэкан пэдфаку праф. Піотуховіч.

— Дасягненьнем мы лічым ня толькі гэты пяты выпуск, ёсьць вялікія дасягненьні і ў жыцьці самога пэдфаку. Мы маем узмацненьне матар'яльнай базы: новае абсталяваньне габінэтаў, папаўненьне пэдфаку падручнікамі і інш. навуковай літаратурай. Акрамя гэтага пэдфак папоўніўся новымі навуковымі сіламі—сіламі марксыстых. Калі мы на пранягу 7 год першых чатырох год вучобы кожны год мянялі навучальныя пляны, то апошнія 3 гады мы маем больш сталыя, стабільныя пляны, прыстасаваныя да жывых патрэб культурнай і эканамічнай рэвалюцыі нашай краіны

— Шмат зроблена пэдфакам у галіне нацпалітыкі.

У сваёй працы пэдфак пад беларусізацыяй разумее ня толькі вывучэньне беларускай мовы і пад нацпалітыкай—ня толькі беларусізацыю ВНУ. Мы стала прыступілі да вывучэньня нацыянальнай культуры ў цэлым — вывучаем краіну, бел. прыроду, гаспадарку. Мы маем 20 проц. усіх навучальных гадзін і на яўрэйскай мове.

Выпускнікі сябе апраўдаюць на працы. Парукай у гэтым—сацыяльны склад іх, пахаджэньне іх, сувязь з рабочымі і бяднейшым сялянствам.

Парукай за посьпех будзе таксама іх падрыхтоўка, набыты імі мэтад дыялектычнага матэрыялізму, іх грамадзкая актыўнасьць.

Пасьля Піотуховіча выступіў нарком асьветы т. Баліцкі.

— Папярэднія выпускі, — кажа т. Баліцкі,—апраўдалі сябе на працы. Апраўдае сябе і гэты выпуск, бо ён вучыўся куды ў лепшых умовах, чым папярэднія.

Вы, пэдфакаўцы, накіроўваецеся на адказнейшую працу.

Рукамі пэдагогаў мы павінны зрабіць вялікую справу—справу культурнай рэвалюцыі.

Вось чаму гэтыя рукі, рукі пэдагога павінны быць моцнымі. Іх моц складаецца з двух галоўных момантаў: кваліфікацыя і ідэалёгія. Грош цана была-б таму настаўніку, які быў-бы добра кваліфікаваны, але па сваёй ідэалёгіі быў-бы чужы нам; нічога ня варты і той настаўнік, які-б меў пралетарскую ідэалёгію, але без кваліфікацыі. Універсытэт навучае ня толькі вучыць, але і перавыхоўваць.

Выступіўшы рэктар БДУ праф. Пічэта спыніўся на цяжкіх умовах, пры якіх прыходзілася працаваць выпускніком.

У адказным слове ад імя выпускнікоў т. Іванішчэнка адзначыў:

— Мы з гонарам выканаем усе надзеі і пажаданьні ўраду і камуністычнай партыі. Нашых сіл хопіць, каб яшчэ вышэй узьняць сьцяг ваяўнічага марксызму, каб ня ў брыву, а ў вока ўдарыць па буржуазным загніўшым сьвеце.

С. В—к.

Студэнты—вёсцы

Беларускае студэнцтва арганізавала дзьве камуны

ЦБ пралетстуду падагуліла вынікі ўдзелу студэнцтва 13-ці навучальных устаноў Беларусі ў правядзеньні пасеўной кампаніі.

Сёлета студэнцтва Беларусі асабліва шырока разгарнула работу па аказаньні дапамогі працоўнаму сялянству. Студэнты правялі па вёсках 448 сходаў сельска-гаспадарчага актыву, жанчын, пленумаў сельсаветаў. На гэтых сходах закраналіся пытаньні аб сельска-гаспадарчым падатку, аб ачыстцы насеньня, калектывізацыі і г. д. У зборы попелу прымалі ўдзел усе навучальныя ўстановы. Сабрана 1.163 пуды попелу і 47 пуд. торфу.

У БДУ сабрана для падшэфных вёсак 2.500 руб. Студэнцкія арганізацыі закупілі 6 с.-г. бібліятэк. 9 плугоў, брыгады адрамантавалі 63 с.-г. прылады. Арганізаваны тры паказальныя вучасткі і 6 агародаў. Некаторыя с.-г. навучальныя ўстановы дазволілі сялянам карыстацца сваімі машынамі («трыер»і інш.). Пры ўдзеле студэнцтва Мар'іна-горскага с.-г. тэхнікуму закантрактавана 30 проц. пасеўнай плошчы гэтага раёну.

Дзякуючы рабоце студэнцтва ў розных раёнах Беларусі арганізаваны дзьве камуны, 6 арцеляй, 47 розных таварыстваў, 16 с.-г. гурткоў.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— У чацьвер, 20 чэрвеня, а 12 гадзіне днём у клюбе акрвыканкому (пляц Волі) адбудзецца шырокая нарада ўсіх загадчыкаў аддзеламіі і акр. інспэктароў Менакрвыканкому, прадстаўнікоў аргаддзелу ЦВК, усіх наркаматаў, Белкаапсаюзу, Белсельсаюзу, Белсельбанку і інш. центральных устаноў па пытаньню:

АБ ПАЛЕПШАНЬНІ РАБОТЫ І РЭАРГАНІЗАЦЫІ РАЁННАГА САВЕЦКАГА АПАРАТУ—

на падставе матар'ялаў работы камісіі ЦКК-РСІ ў Пухавіцкім раёне, Мен. акругі. Запрашаюцца ўдзельнікі пленуму АВК.

НК РСІ.

Камісія па чыстцы беспрацоўных разумовай Сэкцыі Менскай Біржы Працы на 19 чэрвеня г. г. а 6 гадзіне ўвечары выклікае наступных беспрацоўных:

Любецкі Уладзімер Маісеяў, Марголіна Фрайда Янкелява, Эйдэльман (былы працаўн. Белпасрэдніку), Казлоўскі Пятро (былы прац. Акрпракуратуры), Мінкевіч Неаніла (таксама), Рабуніко Міхась Уладзімераў, Май Роня Барысаўна, Курыленак Федар Андрэяў, Хахлоў Апанас Сяргеяў, Александроўскі Міхась Сямёнаў, Вайновіч Аляксандр Мартынаў, Сакаў (былы працаўнік НКЮ), Гальбурт Песя Есяляўна, Мірончык (былы прац. Гандльбудтрэста), Каплан Г. П. (таксама), Ходаш Ю. М. (таксама), Пакроўскі В. М. (таксама), Бабіцкі І. В. (б. працаўнік Менакрстатбюро), Каліненка В. О. (б. працаўнік Менакрстатбюро), Затурэмская М. Н. (б. працаўнік Менакрстатбюро), Арадоўскі В. Ф. (б. працаўнік Менакрстатбюро), Зубенак Д. І. (б. працаўнік Менакрстатбюро), Стражэўскі М. Ф. (б. працаўнік Менакрстатбюро), Мякінькіаў Ф. І. (б. працаўнік Менакрстатбюро), Страшалеўскі М. Н. (б. працаўнік Менакрстатбюро), Сьмірноў П. А. (б. працаўнік Менакрстатбюро), Юзьвюк І. Д. (б. працаўнік Менакрстатбюро), Жураўлёў І. Д. (б. працаўнік Менакрстатбюро).

Камісія просіць рабочых, служачых і беспрацоўных прыняць актыўны ўдзел у чыстцы беспрацоўных і даваць маючыяся ў іх матар'ялы.

Камісія па чыстцы Біржы Працы.

— У суботу, 22 чэрвеня г. г., а 5 гадзіне вечарам у памяшканьні Фрунзаўскага райкому КП(б)Б склікаецца пашыраная нарада бюро будаўнічых ячэек раёну, сумесна з кіраўнікамі-партыйцамі будаўнічых арганізацый, на пытаньнях.

Аб ходзе будаўнічага сэзону і аб пастаноўцы масавай работы сярод будаўнічых і сэзонных рабочых.

На нарадзе павінны быць: бюро ячэйкі Белдзяржбуду, Гандальбудтрэсту, саюзу будаўнікоў, Вадаканалу, цагельнай, будаўнічага аддзелу Белжылсаюзу, бюро ячэек пабудоў Белдзяржбуду, усе кіраўнікі-партыйцы вышэйадзначаных будаўнічых арганізацый, фракцыя прэзыдуму ЦП будаўнікоў, старшыні рабочкомаў-партыйцы і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал-партыйцы усіх вышэйпаказаных будаўнічых арганізацый.

— Дом Асьветы. Сёньня 19/VI—роўна, а 7-ай гадзіне ўвечары ЦП саюзу Белпрацасьветы склікае нараду усіх асьветнікаў гор. Менску, запісаўшыхся паехаць на экскурсію па маршруту—Горкі—Асінбуд—Дняпрабуд, з мэтай вырашэньня арганізацыйных пытаньняў, зьвязаных з паездкай.

— Дом Асьветы. У суботу 19 чэрвеня, роўна а 7 гадзіне ўвечары адбудзецца сход тэх. працаўнікоў саюзу працасьветы з наступным парадкам дня:

1. Даклад а 5-гадовым пляне разьвіцьця народнай гаспадаркі

2. Выбары в экскурсантаў для паездкі ў далёкія экскурсіі.

Яўка ўсіх абавязкова.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

ТЭАТР і КІНО

ГАСТРОЛІ ленінградзкага „КРАСНОГО ТЕАТРА"

ТЭАТР „ПРАФІНТЭРН" Серада, 19-га чэрвеня. „ФЕРМА" п'еса у 3 дзеях 10 абразох Ю. О'Нэйля. Пачатак а 8 г. 30 м. Білеты у раб. касе.

КІНО-ТЭАТР „Культура" Новы буйны мастацкі баявік „КАЛАМУТА" кіно-аповесьць у 7 частках. Пач. роўна а 8 г. увеч. Каса—ад 5 гадз.

Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Савецкая, 71. Вялікі мастацкі фільм „ХРОМОЙ БАРИН" 2 сэансы—пачатак 1-га а 9 г., 2-га а 10 г. 30 м. Каса ад 7 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал Буйны мастацкі фільм „ЛАВИНА" кіно-аповесьць у 7 част. Пачатак роўна а 7 з пал. гадз. увеч. Касса адкрыта ад 6 г.

КІНО Пралетары Мастацка-гіс арычны фільм Пэрла Сэміраміды драма ў 7 частках. Пачатак а 7 г. 30 м. Каса—ад 6 г.

КІНО СпартаК Грандыёзны фільм „Степан Халтурин" драма ў 9 частках. Каса—ад 6 гадз. Пачатак 1-га сэансу а 7 г. 30 м.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня

СЁНЬНЯ, серада 19 чэрвеня

ДЗЯРЖЦЫРК

Апошняя гастроль артыстых:

1-шы раз у БССР заслуж. арт. рэспублікі Грузіі Бр. ТАНЦІ

Апошняя гастроль адзінай у СССР трупы акрабатаў - прыгуноў Увесь цырк аплёдыруё! 10 Океанос 10

Апошняя гастроль улюбенцаў Масквы клёунаў - сатырыкаў АЛЬПЕРАВА І МАКСА

Апошняя гастроль 4 Юліанс 4 Галаваломныя трукі! Шедэўр цыркмастацтва!

1-шы раз у Менску „Конкурс прыгунов"

1-шы раз у Менску Конкурс бічуючай сатыры цэнтральнай і мясцовай.

З прычыны вялізарнай праграмы, пачатак прадстаўленьня роўна а 9 гадз. увечары.

Обвестка

МЕНАКРСТРАХКАСА АБВЯШЧАЕ

што весткі аб зарплаце, выплачанай у маі м-цы павінны быць прадстаўлены па новых формах разрахункових ведамасьцяй да 25-га чэрвеня,

для чаго страхавацелі, якія яшчэ не атрымалі кніжкі новых форм разрахунковых ведамасьцяй, павінны гэткія атрымаць ад Страхкасы, а на раёнах ад райўпоўнаважаных да паказанага вышэй тэрміну, а ў далейшым весткі аб зарплаце прадстаўляць штомесячна ДА 7-га ЧЫСЛА за мінулы месяц.

УВАГА: Страхавацелі, якія ўжо прадставілі гэтыя весткі, але па старых формах разрахунковых ведамасьцяй, таксама павінны прадставіць весткі за май па новай формы.

Вінаватыя ў непрадстаўленьні разрахунковых ведамасьцяй у паказаныя тэрміны будуюць у адміністрацыйным парадку абкладзены штрафам у разьмеры да 100 рублёў

Нам. старшыні Менакрстрахкасы Кейштат
Ст. Бухгальтар Слоўшчар

30 чэрвеня г. г. у Маскве адбудзецца ПЕРШЫ ТЫРАЖ Дзяржаўнае унутранае выйгрышнае пазыкі 1929 году.

Усяго будзе разыграна 5.600 выйгрышаў на суму 1.053.100 руб.

ГАЛОЎНЫЯ ВЫЙГРЫШЫ:

1 выйгрыш у 100.000 рублёў
1 „ у 50.000 „
2 „ па 25.000 „
5 „ па 10.000 „
10 „ па 5.000 „ і інш.

АБЛІГАЦЫІ прадаюцца ва установах Дзяржбанку, Ашчаднасах і іншых крэдытных установах.

АДКРЫТА ЗУБА-ЛЯЧЭБНІЦА

Мен. Акр. К-ту Чырвонага Крыжу, Інтэрнацыянальная вул., д. № 6.

Лячэньне, плёмбаваньне зубоў, выдаленьне бяз болю, лячэньне хвароб поласьці роту.

УСТАЎКА ШТУЧНЫХ ЗУБОЎ на каўчуку і золаце.

Цэны агульнадаступныя. Парада дармова.

У пячэбніцы працуюць кваліфікаваныя зубныя дактары з вялікім практычным стажам.

Членам Чырвонага Крыжу—СКІДКА.

Прыём з 9 з пал. г. ран. да 8 з пал. гадз. увечары штодзенна.

Згубленыя і ўкрадзеныя дакументы лічыць несапраўднымі

Рэгістрац. пасьведч. Русак Р. З., выд. Менакрфа. 1909
Кавэрац. кн. № 700 Бурава В. М., выд. Менскім прыгар. спажыв. т-вам „Земляроб". 1910
Камсамольскі білет № 2077 Кадюшчыка А. І., выд. Менскім акругкомам ЛКСМБ. 1911
Асабов. пасьведч. Пяткоўскага К. І., выд. адмаддзел. Менск. АВК. 1912
Кандыдацкая картка № 3400 Партасенак А. І., выд. Кастрычнік. райкомам КП(б)Б. 1913
Бістэрміновая пашпартная кніжка Стахоўскага І. І. 1914
Асабов. пасьведч. Стахоўскай М. О., выд. к-рай 4 вуч. аддзелу цягі ст. Менск МБЕ ч. 1915
Асабов. пасьведч. Стахоўскай Л. І., выд. к-рай 4 вуч. аддзелу цягі ст. Менск МБЕ чыг. 1916
Пашпарт Грынгауза З. С., выд. Менскай міліцыяй. 1917
Патэнт 1 разр. Біндлер Х. А., выд. Менск. акрфа. 1918
Згублен бумажнік з грашыма і дакумантамі на імя Анісовіча Альгерда Антонавіча. Знайшоўшага прашу грошы пакінуць сабе, а бумажнік з дакумантамі вярнуць па адрасе: Савецкая, 143, Польвдтэхнікум, курсанту Анісовічу А. А.

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ дастаўкі газэты „ЗЬВЯЗДА" звяцце па тэл. 2-49

Даю уроки нямецк., франц., анг. яз. В. МАЛЬБИН, ул. Освобождения, 19-4

ТРЕБУЙТЕ ВСЮДУ ЮЖХИМТРЕСТ ЛУЧШИЙ СОВЕТСКИЙ КАРАНДАШ.